«Пенсійная сістэма — гэта страхавая сістэма, якая мае пэўныя ўмовы для ўступлення і для атрымання выплат. Таму пяцігадовы перыяд працоўнага стажу вельмі малы...» СТАР 2

За кошт таго, што «Картка навучэнца» з'яўляецца паўнавартаснай аплатнай карткай буйнейшай фінансавай установы краіны, у школьнікаў з'яўляецца магчымасць разлічвацца з яе дапамогай у школьных сталовых, буфетах. СТАР 5

…Такіх прывабных рэчаў побач было шмат – ручнікі, посцілкі, спадніцы, андаракі… Усё прывезена з экспедыцыі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства ў Горацкі раён Магілёўскай вобласці. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

10 ВЕРАСНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 169 (27534) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВЫЗНАЧАНЫ ЛАЎРЭАТЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ 2012 ГОДА

Лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2012 года сталі 16 чалавек. Указ №401 «Аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2012 года» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 9 верасня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Указам прысуджаны тры прэміі ў галіне навукі і тэхнікі і тры прэміі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за работы, якія характарызуюцца навуковай навізной і маюць значную эканамічную эфектыўнасць ці сацыяльную значнасць для Беларусі, а таксама атрымалі шырокае прызнанне беларускай і міжнароднай грамадскасці.

Дзяржаўнай прэміяй **у галіне навукі і тэхнікі** адзначаны цыкл работ «Новыя неарганічныя злучэнні і матэрыялы на аснове мікра- і нанаразмерных часцінак: атрыманне, уласцівасці, прымяненне» . Ён мае высокую навуковую каштоўнасць і змяшчае вынікі сусветнага ўзроўню навізны, атрыманыя за 35-гадовы перыяд даследаванняў. Аўтарамі Міхаілам Арцем'евым, Анатолем Лесніковічам і Алегам Івашкевічам упершыню сінтэзаваны больш за 100 новых злучэнняў, якія знайшлі прымяненне ў розных галінах і ў розных краінах свету.

Гэтай прэміі таксама ўдастоена праца «Распрацоўка і шырокамаштабнае ўкараненне нацыянальных сродкаў абароны дакументаў, каштоўных папер і асабліва каштоўных аб'ектаў на аснове галаграфічных метадаў». Аўтарамі Леанідам Таніным, Пятром Маісеенкам і Мікалаем Макарэвічам распрацаваны і ўкаранёны нацыянальныя надзейныя сродкі абароны ад падробкі каштоўных папер, якія маюць сусветны прыярытэт. Навуковая каштоўнасць гэтай работы заключаецца ў развіцці фізічных прынцыпаў і распрацоўцы ўнікальных галаграфічных тэхналогій, якія з'яўляюцца бясспрэчным дасягненнем беларускіх вучоных і інжынераў.

Акрамя таго, дзяржаўнай прэміяй у галіне навукі і тэхнікі заахвоцілі працу «Распрацоўка і асваенне вытворчасці спецыяльных колавых шасі і цягачоў чацвёртага пакалення ваенна-тэхнічнага і двайнога прызначэння». Аўтары працы Андрэй Галавач, Юрый Нікалаеў і Яўген Гарко стварылі аснову для арганізацыі ў Беларусі ўласнай вытворчасці спецыяльных колавых шасі і цягачоў, якія істотна пераўзыходзяць па сваіх характарыстыках машыны папярэдняга пакалення.

Дзяржпрэміяй **у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры** адзначаны спектакль «Пінская шляхта» па п'есе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Творчы калектыў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы стварыў спектакль, які стаў выдатнай з'явай у тэатральным жыцці краіны і ўяўляе сабой яркае ўвасабленне класікі сучаснымі сцэнічнымі сродкамі. Гэтая пастаноўка атрымала высокую ацэнку і прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Прэмія прысуджана народнаму артысту Беларусі Віктару Манаеву, мастаку-пастаноўшчыку Вользе Мацкевіч і кампазітару Андрэю Зубрычу.

За выдатныя дасягненні вакальнага і выканаўчага майстэрства дзяржаўнай прэміі ўдастоена артыст-вакаліст — вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Ніна Шарубіна. Артыстка, якая валодае голасам рэдкага тэмбру, за кароткі час стала вядучай салісткай тэатра оперы і балета, дэманструючы цудоўны вакал, віртуозную пеўчую тэхніку і талент драматычнай актрысы. Яе творчасць з'яўляецца вышэйшым дасягненнем беларускага мастацтва апошняга часу.

Дзяржаўнай прэміяй за стварэнне шматпрофільнага культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» адзначаны аўтарскі калектыў у складзе Валерыя Куцко, Уладзіміра Будаева і Анатоля Шабаліна, які стварыў найбуйнейшы спартыўна-культурны аб'ект на тэрыторыі краіны, што па сваім маштабе, інжынернаму і мастацкаму вырашэнню параўнальны з найлепшымі ўзорамі сучаснай сусветнай архітэктуры.

Прыняцце ўказа сведчыць пра высокую ацэнку і прызнанні дзяржавай заслуг выдатных людзей Беларусі, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё нацыянальнай навукі, культуры і мастацтва.

■ Этнапрастора

«КАМЯНІЦА»: СВЯТА, НА ЯКІМ ХОЧАЦЦА ЎСІХ АБНЯЦЬ

Фота БЕЛТА.

Усю дарогу да музея народнай архітэктуры і побыту здзіўленыя бабулькі-дачніцы з цікаўнасцю паглядалі ў аўтобусе на апранутых у вышыванкі маладых людзей, якія гаманілі паміж сабой па-беларуску і спявалі народныя песні. Пэўна, думалі, што едуць нейкія артысты. Некаторыя пасажыры з веданнем справы пыталіся: «Вы на фестываль едзеце?» Зрэшты, апазнаць наведнікаў фэсту можна было і без «асаблівых прыкмет»: нешта няўлоўнае выдавала ў іх «камянічнікаў»...

Сёлета штогадоваму фолк-фестывалю «Камяніца», які яднае музычныя традыцыі розных краін, споўнілася пяць гадоў. З гэтай нагоды арганізатары загадзя абвясцілі: фэст будзе доўжыцца не адзін, як звычайна, а два дні. Але сюрпрыз, як аказалася, быў далёка не для ўсіх: трапіць на «Сяброўскую вячэру», што праходзіла ў першы фестывальны дзень, можна было выключна па запрашальніках. Мерапрыемства апраўдала сваю назву: з самага пачатку гасцей частавалі рознымі прысмакамі і напоямі. Пасля таго, як арганізатары абвясцілі адкрыццё фэсту, адбыліся майстар-класы па прыгатаванні страў беларускай кухні: дранікаў (чамусьці не бульбяных, а гарбузовых) і верашчакі, якія можна было пакаштаваць. Упершыню мне выпала пачаставацца і традыцыйным гарачым напоем з зёлак і мёду — збітнем. Духмяны і вітамінны, ён аказаўся вельмі прыемным на смак. СТАР 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінгарвыканкама:

«Неабходна паставіць задачу кіраўнікам прадпрыемстваў забяспечыць ахоп вакцынацыяй супраць грыпу ў сярэднім 50% работнікаў. Формы арганізацыі гэтай працы павінны быць гнуткімі, магчымая частковая аплата вакцыны работнікам. Гэта задача ў тым ліку і эканамічнага характару, якую мы абавязаны выканаць».

ПРАМАЯ ЛІНІЯ МУС

ВЫ Ў ПАРАДКУ?

На вашы пытанні, звязаныя з асабістай і маёмаснай бяспекай, ахоўнымі паслугамі, бяспекай дарожнага руху, своечасовым рэагаваннем на паведамленні аб правапарушэннях, грамадскім парадкам і прафілактыкай злачынстваў адкажа **намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі генерал-маёр міліцыі Мікалай Аляксандравіч МЕЛЬЧАНКА.** «Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца ў Міністэрстве ўнутраных спраў **11 верасня,** у сераду, **з 11.00 да 12.00** па нумары: **(8-017) 218 55 30**.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 10.09.2013 г.

Долар ЗША	9030,00	▼
Еўра	11900,00	▲
Рас. руб.	271,00	▲
Укр. грыўня	1105,94	▲

ДЗЕЙНІЧАЦЬ ЗГОДНА З АДЗІНЫМ ПЛАНАМ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 9 верасня сустрэўся з генеральным сакратаром Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Мікалаем Бардзюжам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі да маючай адбыцца 23 верасня ў Сочы сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, а таксама беларуска-расійскага сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2013».

«Я хацеў бы з вамі абмеркаваць шэраг пытанняў, якія, упэўнены, вас цікавяць. Гэта сустрэча кіраўнікоў дзяржаў АДКБ, якая адбудзецца ў апошняй дэкадзе верасня. І практычна ў гэты ж перыяд пройдзе вучэнне «Захад-2013», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што хацеў бы пачуць меркаванне Мікалая Бардзюжы, а таксама кіраўнікоў дзяржаў, з якімі той сустракаўся, іх рэакцыю на ўсе актуальныя праблемы.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Апошнім часам у нас вельмі шмат інфармацыйных і іншых пытанняў у беларуска-расійскіх адносінах. Я гатовы абмеркаваць з вамі пытанні, якія могуць узнікаць у сувязі з гэтым, таму што апошні месяц выйшаў ужо занадта бурны ў нашых адносінах, маса непаразуменняў у гэтым плане, і я хацеў бы вас праінфармаваць і пачуць вашы ацэнкі». СТАР 2

■ Чалавек робіць, а зямля родзіць

СВАЁ — ЗНАЧЫЦЬ ЛЕПШАЕ?

Некаторыя яшчэ ўчора экзатычныя для Беларусі сельгаскультуры становяцца даволі папулярнымі як у адпаведных прадпрыемстваў, так і ў фермераў, не кажучы пра прысядзібныя ўчасткі. Тыповы прыклад: добра знаёмы і многімі любімы з-за сваіх смакавых і асабліва лекавых якасцяў кавун набывае сталую прапіску на нашых палях. Пакуль што мы яго спажываем свежым, а ёсць жа і сок кавуновы, і кавун сушаны, і кавун салёны, і мочаны... Старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі аграхіміі і харчавання раслін Інстытута агародніцтва кандыдат сельскагаспадарчых навук Андрэй Бадзько лічыць кавун для нашай краіны стратэгічнай культурай.

Кавун — трэці хлеб?

— Гэта не перабольшванне, бо кавун, у адрозненне ад большасці культур, не патрабуе ўрадлівых глебаў. А ў нас, асабліва на поўдні і паўднёвым захадзе краіны, у Гомельскай і Брэсцкай абласцях, такіх пясчаных і лёгкіх земляў хапае. На іх складана атрымліваць добрыя ўраджаі іншых культур, ды і кліматычныя ўмовы там для вырошчвання кавуноў у адкрытым грунце даволі спрыяльныя. Першымі такую магчымасць заўважылі фермеры і гаспадары прысядзібных участкаў, якія пачалі разводзіць кавуны на невялікіх плошчах. З 2007 года гэтую тэматыку пачаў весці наш інстытут, і да 2011 года была ўжо распрацавана тэхналогія вырошчвання. СТАР 5

Фота БЕЛТА.

■ Надвор'е

ЦЁПЛА. І «ГРЫБНЫЯ» ДАЖДЖЫ...

Гэтымі днямі надвор'е ў Беларусі пагоршыць больш вільготнае паветра, што рухаецца да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.

Такім чынам, у аўторак чакаецца воблачнае надвор'е, калі месцамі па Брэсцкай, Гродзенскай і Віцебскай, а таксама па захадзе Мінскай вобласці пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень плюс 17-23 градусы. Даволі цёплае і няўстойлівае надвор'е захаваецца ў нас у сераду і чацвер. Таму месцамі будуць ісці кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы 7-13 цяпла, удзень плюс 16-22 градусы.

Паводле папярэдніх разлікаў айчынных спецыялістаў, з пятніцы і на выхадныя на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць больш вільготнае паветра з боку Міжземнага мора. Таму ў гэтыя дні амаль паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы сярэдняй інтэнсіўнасці. Уначы стане яшчэ цяплей — 9-14, удзень будзе плюс 13-18 градусаў, а па паўночным захадзе пры праясненнях да 19-22 цяпла.

Сіноптыкі падлічылі, што такі тэмпературны фон прыкладна на 2-3 градусы вышэйшы за кліматычную норму. Паводле слоў Людмілы Парашчук, менавіта таму пра «бабіна лета» гаварыць сёння зарана. Будзем чакаць яго ў другой палове верасня ці ў першай дэкадзе кастрычніка.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БРЫТАНСКІ ПРЭМ'ЕР ПАКІНУЎ БЕЗ НАГЛЯДУ САКРЭТНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран, як мяркуецца, пакінуў адкрытым і без нагляду свой міністэрскі кейс з сакрэтнымі дакументамі. Неназваны грамадзянін у цягніку Лондан-Эдынбург, у якім таксама знаходзіўся Кэмеран, зрабіў фотаздымак. На ім відаць так званы чырвоны чамаданчык з надпісам «прэм'ер-міністр». Такія кейсы выкарыстоўваюцца для транспартавання сакрэтных рабочых дакументаў. На здымку відаць, што чамаданчык ляжыць на стале без нагляду, пры гэтым у замок устаўлены ключ. Згодна са спецыяльнай інструкцыяй, якая выйшла ў 1999 годзе, міністры і прэм'ер-міністр абавязаны гарантаваць канфідэнцыяльнасць сакрэтных рабочых дакументаў, якія знаходзяцца ў кейсе, калі яны выкарыстоўваюць грамадскі транспарт.

МАСКВІЧЫ ВЫБРАЛІ САБЯНІНА, НАВАЛЬНЫ ПАТРАБУЕ ДРУГІ ТУР

Масквічы 8 верасня выбіралі кіраўніка горада на бліжэйшыя пяць гадоў. Паводле звестак Масгарвыбаркама, часовы выканаўца абавязкаў мэра сталіцы Сяргей Сабянін выйграе выбары ў першым туры, набраўшы больш за 50% галасоў выбаршчыкаў. Сабянін пасля падліку 100% пратаколаў набраў 51,37%, Аляксей Навальны — 27,24%. Камуніст Іван Мельнікаў набраў 10,69%, лідар «Яблыка» Сяргей Мітрохін — 3,51%, дэпутат Дзярждумы ад ЛДПР Міхаіл Дзегцяроў — 2,86%, кандыдат ад «Справядлівай Расіі» Мікалай Левічаў — 2,79%. Яўка на выбарах мэра Масквы склала 32,07%. У сваю чаргу Аляксей Навальны ўжо адмовіўся прызнаваць папярэднія вынікі і заявіў, што выбары павінны прайсці ў два туры.

У ТУРЦЫІ ЎЗЯЛІСЯ ЗА ТАКСІСТАЎ

У Турцыі звольнілі больш за пяць тысяч таксістаў, якія маюць крымінальнае мінулае. У Стамбуле наўрад ці знойдзецца чалавек, якога не падманвалі ў таксі. Фальшывыя квіткі, няправільная рэшта, рабаванні — кожны год улады сталіцы атрымліваюць тысячы скаргаў ад падманутых пасажыраў. Нядаўна ў горадзе вырашылі пакласці канец падобным здарэнням. Цяпер пры ўладкаванні на працу таксістам кандыдаты абавязаны прад'яўляць даведку аб адсутнасці судзімасці. Вынікі не прымусілі сябе доўга чакаць. За апошні час сярод больш чым дзвюх тысяч скаргаў на таксістаў не было ніводнай заявы аб крадзяжы, падмане або грубасці. 85% скаргаў паступалі з-за таго, што таксісты проста адмаўляліся везці пасажыра, матывуючы гэта тым, што адлегласць была занадта кароткай.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ААН НАЗВАЛА САМЫЯ ШЧАСЛІВЫЯ КРАІНЫ СВЕТУ

ААН апублікавала рэйтынг самых шчаслівых краін свету. Верхнія радкі рэйтынгу занялі Данія, Нарвегія, Швейцарыя, Нідэрланды і Швецыя. Усяго ў рэйтынгу 150 краін. У якасці ацэначных крытэрыяў эксперты абралі шэсць фактараў: рэальны ВУП на душу насельніцтва, працягласць здаровага жыцця, магчымасць спадзявацца на каго-небудзь у найбліжэйшым акружэнні, суб'ектыўная ступень свабоды ў прыняцці жыццёвых рашэнняў, абароненасць ад карупцыі і шчодрасць.

У першую дзясятку шчаслівых краін трапілі таксама Фінляндыя, Канада, Аўстрыя, Ісландыя і Аўстралія. У другім дзясятку — ЗША і Новая Зеландыя, замыкае яго Венесуэла. З краін СНД у спісе Малдова, Казахстан, Туркменістан, Узбекістан, Беларусь, Расія. Як і летась рэйтынг замыкаюць краіны Афрыкі — Гвінея, Танзанія, Руанда, Бурундзі, Цэнтральная Афрыканская Рэспубліка, Бенін і Тога.

КАРАТКА

У Сірыі яшчэ застаюцца каля 80 грамадзян Беларусі, паведамілі ў МЗС Беларусі. Калі хто-небудзь з астатніх грамадзян выкажа жаданне вярнуцца ў Беларусь, то будзе аказана неабходнае садзейнічанне.

У Беларусі дзеянне тэлефона даверу па праблемных пытаннях у будаўніцтве падоўжана да канца верасня 2013 года. Рашэнне аб падаўжэнні прынята ў сувязі з вялікім патокам зваротаў грамадзян са скаргамі, якія паступаюць з усіх рэгіёнаў краіны.

Расійскія ваенныя з падраздзяленняў Заходняй ваеннай акругі адправіліся ў Беларусь на сумеснае вучэнне «Захад-2013». На тэрыторыю Беларусі адправіцца 2,5 тыс. расійскіх ваеннаслужачых.

Дзіцячыя крэслы збераглі гадавалых двайнят у сур'ёзнай аварыі ў Мінску на вуліцы Бабруйская. Аўтамабіль «Сітраен» з двума дзецьмі не саступіў дарогу «Фольксвагену» і ў выніку моцнага ўдару перакуліўся на дах. У такой аварыі абышлося без пацярпелых. Дзіцячыя крэслы надзейна ўтрымалі двайняты, абодва кіроўцы былі прышпіленыя рамянямі бяспекі.

ЦІ ЛЕГКА ВЫ ПРЫЗВЫЧАІЛІСЯ ДА СТУДЭНЦКАГА РЫТМУ ЖЫЦЦЯ?

Ірына СТАРАВОЙТАВА, педагог-арганізатар у дзіцячым доме № 7, г. Мінск:

— Прывыкла дзесьці за месяц: і веды, якія атрымлівала на занятках, сталі нармальна ўспрымацца, і з аднакурснікамі за гэты час больш-менш «скантактавалася». Толькі вось ісці на першыя лекцыі чамусьці было страшнавата: не ведаеш, якая цябе чакае атмасфера, што давядзецца вучыць. Мне не прыйшлося пераязджаць ад бацькоў — гэта, безумоўна, плюс.

Але не думаю, што аднакурсніцы, якія прыехалі на вучобу ў сталіцу, надта пакутавалі з-за таго, што разлучыліся з домам. Хадзілі па дыскатэках, весяліліся. Для іх першы месяц вучобы хутчэй прайшоў не «ў стрэсе», а «на драйве».

Святлана КРЫСЕНКА, студэнтка 3 курса Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:

— Адаптавацца да жыцця ў новым горадзе і вучобы ва ўніверсітэце мне, відаць, было прасцей, чым астатнім. Тут ужо вучылася мая сястра, і я нават пасялілася з ёй у адным пакоі студэнцкага інтэрната. Зразумела, пытанні з харчаваннем і побытам «адпалі» адразу. Праўда, без цяжкасцяў усё ж не абышлося. Калі сустрэлася са сваімі будучымі аднагрупнікамі, крыху пачала нервавацца: мы ўсе вельмі розныя, і невядома, ці добра складуцца ў нас стасункі. Яшчэ, як і многія першакурснікі, я была ўражана першай лекцыяй: занатоўваць амаль нічога не паспявала, што з усяго запісанага пасля вучыць — невядома. Першы занятак па анатоміі — гэта нешта! Не, я не спужалася паходу ў «анатамічку» і вывучэння ўсіх «экспанатаў» у ёй, мяне прывёў у шок аб'ём хатняга задання.

Юлія БАРКОЎСКАЯ, менеджар-эканаміст, г. Мінск:

— Вучоба ва ўніверсітэце не была для мяне неймавернай нагрузкай, да якой трэба было прывыкаць. Можна сказаць, стаўшы студэнткай, я проста чарговы раз нырнула ў жыццёвы вір, у якім круцілася заўжды. Памятаю, што на першым курсе, акрамя наведвання заняткаў, паспявала яшчэ і на фітнэс, а па выхадных хадзіла на плаванне. Што датычыць побыту, то я студэнткай жыла ў Мінску з бацькамі. А вось аднакурснікі з іншых гарадоў сапраўды вучыліся жыць самастойна, па-наваму, і не заўжды гэта было лёгка. Таму часам нехта з «самастойных» сяброўак запрашаўся на вячэру ці прыходзіў пераначаваць, калі неабходна.

Падрыхтавала Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

РАСІЙСКІ СЕНАТАР ВЫКАЗАЎ УДЗЯЧНАСЦЬ БЕЛАРУСІ ЗА ГУМАНІТАРНУЮ ДАПАМОГУ ЖЫХАРАМ ПРЫАМУР'Я

Член Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі ад выканаўчага органа дзяржулады Амурскай вобласці Мікалай Савельеў выказаў удзячнасць Беларусі за аказаную гуманітарную дапамогу жыхарам Прыамур'я, перадае БЕЛТА.

«Мы цэнім, што брацкая Беларусь не засталася ўбаку і аказала дапамогу ўсім амурчанам, якія пацярпелі ад мацнейшай за ўсю гісторыю рэгіёна паводкі», — адзначыў Мікалай Савельеў у гутарцы з журналістамі.

Беларускі самалёт з 43 тонамі дзіцячага харчавання на борце прызямліўся 7 верасня ў аэрапорце Благавешчанска. Дапамагчы Прыамур'ю, якое пацярпела ад паводкі, прапанаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У хуткім часе ў Амурскую вобласць з Беларусі прыбудуць мясныя кансервы. Чакаецца, што ў расійскі рэгіён таксама будзе пастаўлена бульба.

Магутная паводка на Амуры прадаўжаецца ўжо некалькі тыдняў, больш за іншых пацярпела Амурская вобласць, якая першая прыняла ўдар стыхіі. Цяпер найбольш цяжкая сітуацыя склалася ў межах горада Камсамольск-на-Амуры.

Рэжым надзвычайнай сітуацыі таксама захоўваецца ў Якуціі, Хабараўскім і Прыморскім краях, Яўрэйскай аўтаномнай вобласці. Колькасць пацярпелых ад паводкі ў цэлым па Далёкім Усходзе ўжо перасягнула 50 тыс. чалавек. Урон ад стыхіі ацэньваецца мільярдамі расійскіх рублёў.

Дэпутат Аляксандр ЗАЗУЛЯ:

«У АМУРСКАЙ ВОБЛАСЦІ ДУШЭЎНА СТАВЯЦЦА ДА НАШАЙ КРАІНЫ»

Пасля вяртання борту «Іл-76» з Благавешчанска журналіст «Звязды» сустрэлася са старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Аляксандрам Зазулем, які разам з намеснікам міністра МНС Аляксандрам Ганчаровым суправаджаў беларускі гуманітарны груз у пацярпелую ад паводкі Амурскую вобласць.

— Аляксандр Іванавіч, місія выканана паспяхова?

— Так. Мы даставілі ў Амурскую вобласць першы груз гуманітарнай дапамогі — 43 тоны дзіцячага харчавання, які быў сфарміраваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы, неўзабаве будзе адпраўлены другі груз — 50 тон тушонкі, таксама Аршанскага мясакансервавага камбіната. Цяпер абмяркоўваюцца і іншыя віды аказання дапамогі пацярпелым у гэтым рэгіёне Расіі.

— Як праходзіў палёт з Мінска ў Благавешчанск?

— З Мінска мы вылецелі а першай гадзіне дня. Грузавы самалёт «Іл-76» быў загружаны цалкам, нават за кошт эканоміі паліва, у сувязі з чым мы спыняліся на дазапраўку ў Новасібірску. А палове восьмай раніцы па мясцовым часе (апоўначы па Мінску), альбо праз 10 гадзін, мы прызямліліся ў Благавешчанску.

Пасажыраў на борце было толькі два — я і намеснік міністра МНС, генерал-маёр Аляксандр Ганчароў. Умовы пералёту былі спартанскімі — туды на каробках і надзіманых матрацах, назад — на прыстаўных крэслах.

Затое падчас пералёту мы ацанілі перавагі існавання Саюзнай дзяржавы: не было ніякіх затрымак у сувязі з перасячэннем мяжы, праходжаннем мытнага кантролю. Аператыўна адбылася разгрузка самалёта. На сустрэчы з губернатарам Амурскай вобласці Алегам Кажамякам мы вырашылі, што беларускія кансервы будуць размеркаваны ў дзіцячыя ўстановы і шматдзетныя сем'і. Праз 12 гадзін мы вылецелі назад.

Для сябе я са здзіўленнем адзначыў, што ў Амурскай вобласці пражывае вельмі шмат карэнных беларусаў. Іх нямала і сярод кіраўніцтва рэгіёна; напрыклад, у губернатара Амурскай вобласці продкі родам з Беларусі. Таму рашэнне Прэзідэнта Беларусі аб аказанні дапамогі мела вялікі рэзананс у гэтым краі і было з падзякай успрынятае амурчанамі.

Акрамя добрых дзелавых стасункаў, якія ўжо маюцца паміж Амурскай вобласцю і Беларуссю, мы адчулі і вельмі душэўнае стаўленне да нашай краіны. Летась гэты рэгіён наведаў з візітам міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід Заяц. У лютым гэтага года губернатар Амурскай вобласці Алег Кажамяка сустракаўся ў Мінску з Аляксандрам Лукашэнкам. Цяпер многія з дамоўленасцяў паміж кіраўніцтвам нашай краіны і гэтым рэгіёнам Расіі рэалізоўваюцца, і амурчане, па словах губернатара, гатовы ісці далей. Размова ідзе пра аднаўленне сельскай гаспадаркі, бо пасля паводкі там аказаліся знішчанымі пасевы, змыты ўрадлівы слой глебы. Тое, што Беларусь аказалася побач, калі там здарылася бяда, цалкам натуральна.

— Якая там цяпер абстаноўка?

— Дзякуй Богу, вада трошкі пачала сыходзіць. Па-ранейшаму высокі ўзровень вады застаецца ў Камсамольску-на-Амуры. Мы былі па-добраму ўражаныя тым, як у экстрэмальных умовах спрацавала Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Расійскай Федэрацыі. Гэта адзначаюць і самі амурчане: калі б не зладжаная работа спецыялістаў і выратавальнікаў, наступствы паводкі маглі быць значна больш цяжкімі.

— Што з расказаў выратавальнікаў вам найбольш запомнілася?

— Аповеды пра рыбу, якая плавае ў жылых пакоях амурчан...

— Які настрой у пацярпелых?

— Яны духам не падаюць. І ў гэтым ёсць заслуга ўлады вобласці, якая паспяхова змагаецца са стыхіяй. Людзі не адчуваюць сябе кінутымі. Гуманітарная дапамога, якую вобласць сёння атрымлівае адусюль, таксама падтрымлівае настрой людзей. Там ужо распачаліся кампенсацыйныя выплаты.

— Ці абмяркоўваліся падчас паездкі нейкія палітычныя пытанні?

— Не. Амурчане з разуменнем адносяцца да праблем, якія ўзніклі ва ўзаемаадносінах паміж калійнымі кампаніямі нашых краін. Яны падкрэслівалі, што супрацоўніцтва паміж Амурскай вобласцю і Беларуссю можа быць толькі цывілізаваным і канструктыўным. Яны намераны акумуляваць сродкі для закупкі нашай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

КАНЯ ВЫЦЯГНУЛІ З КАЛОДЗЕЖА

У вёсцы Антонаўка Добрушскага раёна выратавальнікі дапамаглі выняць з каналізацыйнага калодзежа дыяметрам 1 м і глыбінёй 2,5 м каня, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС. Інцыдэнт адбыўся на тэрыторыі малочнатаварнай фермы ААТ «Чырвоная Буда». Перапужаную жывёлу, якая належыць мясцовай гаспадарцы, абвязалі, а потым асцярожна выцягнулі з дапамогай «Амкадора-332С4».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДЗЕЙНІЧАЦЬ ЗГОДНА З АДЗІНЫМ ПЛАНАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мікалай Бардзюжа дэталёва праінфармаваў Аляксандра Лукашэнку аб падрыхтоўцы да саміту АДКБ у Сочы. Паводле яго слоў, у цэлым парадак дня падрыхтаваны ўжо. У прыватнасці, на разгляд прэзідэнтаў плануецца вынесці некалькі вельмі важных пытанняў, якія датычацца развіцця сілавога складальніка з улікам сітуацыі ў свеце.

Прадугледжваецца, што прэзідэнты краін — членаў Арганізацыі разгледзяць пакет дакументаў па развіцці ваеннага складніка — гэта рашэнні і адносна стварэння авіяцыйных сіл АДКБ, і па арганізацыі кіравання калектыўнымі сіламі АДКБ.

Акрамя таго, плануецца, што кіраўнікам дзяржаў даложаць аб сітуацыі на таджыкска-афганскай граніцы і ўнясуць прапановы па павышэнні эфектыўнасці аховы граніц Таджыкістана і Афганістана. Група экспертаў з усіх дзяржаў АДКБ, у тым ліку Беларусі, азнаёмілася з аховай дзяржаўнай граніцы з Афганістанам, сістэмай і ўзроўнем аснашчанасці пагранічных войскаў Таджыкістана.

«Мы дэталёва разгледзелі сітуацыю, якая складваецца на граніцы, у цэлым на афганскім прыграніччы, тэндэнцыі развіцця абстаноўкі даволі негатыўныя. Па выніках зроблены вывад — неабходна аказаць дапамогу пагранічнікам Таджыкістана ў аснашчэнні, павышэнні эфектыўнасці аховы граніцы», — праінфармаваў Прэзідэнта Беларусі генеральны сакратар АДКБ.

Ён таксама адзначыў, што напярэдадні сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў у Сочы адбудзецца сумеснае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў, Савета міністраў абароны, Камітэта сакратароў саветаў бяспекі АДКБ. Ужо ўхваленыя імі дакументы будуць прадстаўлены ўвазе прэзідэнтаў.

Аляксандр Лукашэнка і Мікалай Бардзюжа таксама прадметна абмеркавалі тэму падрыхтоўкі да беларуска-расійскага вучэння «Захад-2013», якое пройдзе ў канцы верасня. У вучэнні будуць задзейнічаны беларуска-расійская групоўка, а таксама некаторыя фарміраванні Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ. Прыбудзе кантынгент не толькі расійскіх Узброеных Сіл, але і ўзброеных сіл іншых краін — членаў АДКБ — Казахстана, Таджыкістана, Кыргызстана, Арменіі. Усе яны будуць дзейнічаць згодна з адзіным планам.

НАГАДАЕМ СВЕТУ АБ ЗГУБНАСЦІ ІДЭЙ НАЦЫЗМУ

Святкаванне 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне павінна паслужыць напамінам свету аб згубнасці ідэй нацызму. Аб гэтым учора на першым пасяджэнні рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні знакавых юбілейных дат заявіў яго старшыня, прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, перадае БЕЛТА.

«Неабходна перасцерагчы чарговы раз сусветную грамадскасць ад згубных спроб рэстаўрацыі ідэй нацызму, шавінізму, расавай дыскрымінацыі», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Аргкамітэт і план мерапрыемстваў па святкаванні 70-годдзя вызвалення Беларусі і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне створаны згодна з указам Прэзідэнта № 230.

«Наша задача вельмі важная і адказная. Трэба выканаць на высокім ідэйным, арганізацыйна-тэхнічным і палітычным узроўні задачы кіраўніка дзяржавы», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Асаблівая ўвага ў час пасяджэння аргкамітэта была ўдзелена мерам па сацыяльнай падтрымцы ветэранаў. Плануецца, што да юбілейных дат ветэраны і асобныя катэгорыі грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, двойчы атрымаюць аднаразовую матэрыяльную дапамогу. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны рыхтуе праекты адпаведных указаў. У сваю чаргу Міністэрства абароны прадаўжае работу над заснаваннем і вырабам юбілейных узнагарод.

Павелічэнне мінімальнага стажу для атрымання працоўнай пенсіі зменшыць утрыманскія настроі

Павелічэнне мінімальнага стажу работы з выплатай узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва для назначэння пенсіі па ўзросце або за выслугу гадоў з 1 студзеня 2014 года з 5 гадоў да 10 гадоў зменшыць утрыманскія настроі, заявіў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый Кавалькоў, каментуючы ўказ № 389 «Аб некаторых пытаннях пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання» ад 3 верасня 2013 года, паведамляе БЕЛТА.

«Як ні дзіўна, у нас сёння больш за 3 тыс. чалавек, дасягнуўшы пенсійнага ўзросту, атрымліваюць сацыяльную пенсію. Іншымі словамі, за ўсё сваё жыццё яны і пяці гадоў не адпрацавалі. Для спынення ўтрыманскіх настрояў, іх зніжэння і быў распрацаваны праект указа», — адзначыў намеснік міністра.

«Пенсійная сістэма — гэта страхавая сістэма, якая мае пэўныя ўмовы для ўступлення і для атрымання выплат. Сёння жанчыны, у сярэднім, па ўзросце атрымліваюць пенсіі 24 гады, мужчыны — 14 гадоў. Таму пяцігадовы перыяд працоўнага стажу вельмі малы», — сказаў Валерый Кавалькоў.

Цяпер для атрымання працоўнай пенсіі патрабуецца толькі 5 гадоў работы з выплатай узносаў. Менавіта за такі непрацяглы перыяд работы сёння можна сфарміраваць права на паўнацэнную пенсію. Што датычыцца іншых дзяржаў, то мінімальны стаж для права на працоўную пенсію там вышэйшы. Напрыклад, у Латвіі ён складае 10 гадоў і будзе павялічвацца да 20 гадоў. У Эстоніі і Украіне — 15 гадоў. У Расійскай Федэрацыі разглядаецца пытанне аб паэтапным павышэнні мінімальнага стажу да 15 гадоў.

НЕАБХОДНА ЎДАСКАНАЛІЦЬ ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ВНУ І СЯРЭДНІЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ

Удасканаленне працэсу правядзення ўступных іспытаў і прыёму ў ВНУ і ССНУ Беларусі абмяркоўвалася на рабочай сустрэчы кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшынёй дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2013 годзе Анатолем Рубінавым. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Я ў агульных рысах знаёмы з вынікамі і лічбамі. Мяне больш за ўсё хвалюе праблема ўдасканалення гэтага працэсу. Калі ёсць нейкія праблемныя пытанні, іх трэба падымаць і вырашаць», — сказаў Прэзідэнт. «Вядома, у нас няма таго, што адбываецца ў суседніх краінах, — скандалы, карупцыя вакол гэтага. Гэта ў нас наогул немагчыма. Але, можа быць, аб'ектыўна недзе трэба ўдасканальваць гэты працэс, звярталь больш увагі на нейкія індывідуальныя рэчы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Анатоль Рубінаў далажыў кіраўніку дзяржавы аб выніках уступнай кампаніі. Паводле яго слоў, у цэлым сістэма залічэння ў ВНУ і ССНУ наладжана і дапрацавана да высокага ўзроўню. «Сёння няма вялікіх праблем у гэтай справе. Карупцыя тут фактычна цалкам выключаная, паколькі сам механізм уступных выпрабаванняў, залічэння выключае магчымасць умяшання службовых асоб і каго б там ні было», — канстатаваў ён.

Разам з тым на сустрэчы была адзначана і наяўнасць некаторых праблем. Так, не заўсёды атрымоўваецца ўкамплектаваць асобныя вельмі важныя для краіны спецыяльнасці ў сферы ваеннай, аграрнай, педагагічнай адукацыі. Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым звярнуў увагу на неабходнасць больш старанна прадумаць сістэму мэтавага набору.

Адначасова ў Беларусі склаліся не зусім аптымальныя суадносіны ў падрыхтоўцы кадраў рознай кваліфікацыі, намеціўся відавочны перабор спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Калі не рэгуляваць сітуацыю, то падобныя дыспрапорцыі могуць у канчатковым выніку пайсці на шкоду эканоміцы краіны. «Але гэта ў той жа час не павінна нейкім чынам уплываць на свабоду выбару чалавека. Калі ён здольны, імкнецца, у стане пераадолець парог, значыць, няхай ідзе і атрымлівае адукацыю», — лічыць Анатоль Рубінаў.

Па выніках сустрэчы Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу, каб усе зацікаўленыя бакі сабраліся і дэталёва абмеркавалі наспелыя змены, пасля чаго павінна быць прынята новая рэдакцыя Правілаў прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Пры гэтым гаворка ідзе не пра карэнныя змяненні правілаў, а толькі аб новай іх рэдакцыі. Адно з магчымых нововвядзенняў — электроннае залічэнне, калі перад паступленнем пры рэгістрацыі абітурыент адразу ўказвае, куды і на якія спецыяльнасці ён хацеў бы паступіць, а залічэнне на тую ці іншую спецыяльнасць пасля праводзіцца ў залежнасці ад набраных на іспытах балаў.

■ Здарэнне

У ПАТРЭБНЫМ МЕСЦЫ Ў ПАТРЭБНЫ ЧАС

апынуліся ў Гомелі два адважныя мужчыны. Вечарам кіроўца аўтобуса патэлефанаваў у МНС і паведаміў, што на яго вачах з аўтамабільнага моста цераз Сож маладая жанчына скінула ў раку дзіця і затым сама саскочыла ў ваду.

Да прыбыцця праз некалькі хвілін выратавальнікаў высветлілася, што дапамога ўжо была своечасова аказана двума мінакамі. Супрацоўнікі МНС іх і маладую жанчыну з дзяўчынкай пабачылі на бетоннай апоры моста.

У прэс-службе гомельскага абласнога ўпраўлення МНС расказалі, што адразу ж да месца здарэння быў накіраваны выратавальны катар. Усіх чацвярых на бераг даставілі супрацоўнікі таварыства выратавання на вадзе. У той дзень у Гомелі было ўсяго 9 градусаў цяпла, таму вада ў рацэ была амаль ледзяная. Брыгады «хуткай дапамогі» адвезлі дзіця і жанчыну, якія атрымалі агульнае пераахаладжэнне, ва ўстановы аховы здароўя. На гэты момант маці з дыягназам «востры псіхоз» знаходзіцца ў псіхіятрычнай бальніцы.

Дарэчы, абодва мужчыны на месцы здарэння апынуліся выпадкова. Адзін з іх, 36-гадовы старшы аўтамеханік раённага вузла сувязі «Белтэлекама» Іван Ганчароў быў пасажырам аўтобуса, кіроўца якога пабачыў, як жанчына з 20-метровай вышыні скочыла ў ваду. Ён, калі аўтобус спыніўся, адразу пабег уніз і прасіў: «Дапамажыце яшчэ хто-небудзь». Другі ратаўнік, 28-гадовы ўрач-хірург Веткаўскай раённай бальніцы Аляксандр Карабейнікаў таксама ехаў у гэты час па месце і спыніў сваю машыну, калі пачуў крык аб дапамозе. Ён таксама адразу ж пабег пад мост. З берага ўбачыў, што першы мужчына ўжо выцягвае дзяўчынку, а ў вадзе плавае жанчына і крычыць: «Дапамажыце!» Малады чалавек хутка распрануўся і скокнуў у раку. Такім чынам атрымалася выратаваць і грамадзянку Расіі, жыхарку горада Клінцы.

Фота МНС.

Відавочцы расказваюць, што на беразе жанчына, якая была ў стане алкагольнага ап'янення, казала пра тое, што ў яе забралі кватэру, ёй цяпер няма дзе жыць, таму яна і зрабіла замах на самагубства. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа па артыкуле «Замах на забойства» — па віне жанчыны магла загінуць дзяўчынка. Матывы дзікага ўчынку расіянкі і ўсё, што папярэднічала здарэнню, цяпер высвятляе следства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГСКІ САМІТ G20: АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ

5-6 верасня 2013 года ў Санкт-Пецярбургу прайшоў саміт «Групы дваццаці», вядомай таксама ,як G20. Як адзначыў Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін, які браў удзел у мерапрыемстве, гэта вельмі важная падзея ў тым плане, што вядучыя эканомікі збіраюцца, каб абмеркаваць галоўныя праблемы эканамічнага развіцця.

Сапраўды, у рамках саміту сустракаюцца лідары дзяржаў, на тэрыторыі якіх ствараецца амаль 90% сусветнага ВУП. У той жа час па-ранейшаму цяжка прыйсці да згоды пры сустрэчы краін, якія так адрозніваюцца адна ад адной, як, напрыклад, ЗША і Кітай, Рэспубліка Карэя і Вялікабрытанія, Інданезія і Італія. Заўсёды ёсць шмат супярэчнасцяў. Але яблыкам разладу на саміце, зразумела, стала сірыйская тэма.

У сувязі з выказанай ЗША ініцыятывай ваеннага ўдару па Сірыі без санкцыі ААН адбылося шырокае абмеркаванне. У выніку дамовіцца не ўдалося, і краіны — удзельніцы саміту падзяліліся па гэтым пытанні на дзве групы. Супраць ваеннага ўдару па Сірыі выказаліся Расія, КНР, Індыя, Інданезія, Аргенціна, Бразілія, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Італія. Улічваючы, што ўсе краіны — удзельніцы БРІКС выказалі па гэтым пытанні кансалідаваную пазіцыю, гэта робіць БРІКС важным гульцом у сусветнай геапалітыцы, які ад імя незаходніх краін уступае ў супрацьстаянне з інтарэсамі Захаду.

За самітам уважліва сачылі не толькі палітыкі ўсяго свету, але і прадстаўнікі дзелавой супольнасці, паколькі сітуацыю ў сусветнай эканоміцы цяжка назваць добрай. Як было адзначана на саміце, ацэнкі росту, які чакаўся па выніках 2013 года, апошнім часам неаднойчы зніжаліся, ліквідацыя глабальных дысбалансаў яшчэ не завершана, захоўваюцца значныя рэгіянальныя адрозненні ў тэмпах росту, а беспрацоўе, асабліва сярод моладзі, застаецца недапушчальна высокім. Аднаўленне эканомікі вельмі слабае, і рызыкі па-ранейшаму змешчаны ў бок горшага сцэнарыя.

У той жа час саміт у цэлым зрабіў на ўдзельнікаў дзелавой супольнасці добрае ўражанне, што адлюстравалася ў росце фондавых індэксаў большасці біржаў свету па яго выніках. На гэта паўплывала прадэманстраваная гатоўнасць удзельнікаў саміту зрабіць захады па стварэнні ўмоў для павышэння тэмпаў росту і занятасці ў эканоміцы. А таксама прыняцце своечасовых мер, якія падтрымліваюць і ўмацоўваюць прыкметы аднаўлення росту ў развітых краінах, у інтарэсах усёй сусветнай эканомікі. У падагульняльнай рэзалюцыі краіны Еўрасаюза ўзялі на сябе абавязацельствы па ўмацаванні асновы эканамічнага і манетарнага саюза, у тым ліку за кошт далейшых намаганняў па аздараўленні банкаўскіх балансаў і зніжэнні фінансавай фрагментацыі, а таксама за кошт рашучых дзеянняў па найхутчэйшым стварэнні банкаўскага саюза.

Цікава адзначыць, што ўдзельнікі саміту, па сутнасці, падкрэслілі ключавую ролю дзяржавы пры ажыццяўленні захадаў па паляпшэнні сітуацыі ў сусветнай эканоміцы. Гэта тым больш цікава, улічваючы, што ў саміце бралі ўдзел вядучыя заходнія эканомікі, у якіх яшчэ шэсць гадоў таму адкрыта ўслаўляліся погляды аб нябачнай руцэ рынку, якая ўрэгулюе і паставіць усё на свае месцы без удзелу дзяржавы.

Магчыма, галоўным дасягненнем саміту можна лічыць прыняцце Санкт-Пецярбургскай стратэгіі развіцця, нацэленай на дазвол грамадзянам дзяржаў — удзельніц мерапрыемства магчымасці атрымліваць карысць ад упэўненага, устойлівага і збалансаванага росту. Прынята рашэнне сфакусіраваць намаганні на ажыццяўленні канкрэтных дзеянняў па паляпшэнні харчовай бяспекі, пашырэнні доступу да фінансавых паслуг, развіцця інфраструктуры, развіцця чалавечых рэсурсаў і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Іншае пытанне — наколькі ўзгодненымі будуць дзеянні краін пасля саміту, улічваючы мноства рознагалоссяў паміж імі?

Цікава адзначыць, што ўдзельнікі саміту, па сутнасці, падкрэслілі ключавую ролю дзяржавы пры ажыццяўленні захадаў па паляпшэнні сітуацыі ў сусветнай эканоміцы. Гэта тым больш цікава, улічваючы, што ў саміце бралі ўдзел вядучыя заходнія эканомікі, у якіх яшчэ шэсць гадоў таму адкрыта ўслаўляліся погляды аб нябачнай руцэ рынку, якая ўрэгулюе і паставіць усё на свае месцы без удзелу дзяржавы. Зразумела, галоўны ўплыў на такую трансфармацыю аказаў сусветны крызіс. Хочацца верыць, што такое радыкальнае змяненне падыходаў да ролі дзяржавы ў эканоміцы дазволіць нам пазбегнуць новага сусветнага крызісу таго ж маштабу, што здарыўся ў 2008 годзе.

У галіне барацьбы з карупцыяй удзельнікі саміту прынялі Санкт-Пецярбургскую стратэгічную рамачную праграму. Як вядома, карупцыя перашкаджае ўстойліваму эканамічнаму росту і зніжэнню ўзроўню беднасці, пагражаючы фінансавай стабільнасці і эканоміцы ў цэлым, таму ў сферы рэалізацыі гэтай праграмы можна чакаць супрацоўніцтва і пасля саміту. Тым больш што раней ужо быў прыняты Антыкарупцыйны план дзеянняў «Групы дваццаці».

Цесна пераклікаецца з тэмай барацьбы з карупцыяй і прыняцце мер па паляпшэнні сітуацыі са зборам падаткаў. Як вядома, у рамках глабалізацыі з'яўляецца ўсё больш спосабаў ухілення ад аплаты падаткаў, што вельмі негатыўна ўздзейнічае на здольнасць дзяржаў спраўляцца з сусветным крызісам. Таму на саміце быў прыняты план дзеянняў, які прадугледжвае механізм паляпшэння сістэмы падаткаабкладання.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ЭЛЕКТРОННАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ ПАТРАБУЕ ДАДАТКОВАЙ АПЛАТЫ. ПАКУЛЬ

Даволі часта езджу на цягніках, таму купляць квіток з дапамогай электроннай рэгістрацыі для мяне зусім не рэдкасць. Заўважыла, што кошт праязнога дакумента пры самастойным афармленні крыху вышэйшы, чым пры традыцыйным «стаянні» ў касе...

Параўнайце: купляючы плацкартны білет з Мінска да Брэста непасрэдна ў касе, вы заплаціце 30 тысяч 150 рублёў, а рэгіструючы свой праезд праз інтэрнэт — на дзве з паловай тысячы болей. Здавалася б, эканоміцца папера, працоўны час касіра і, вядома, самога пасажыра. Дык чаму пры набыцці білета з дапамогай электроннай рэгістрацыі яго кошт вышэйшы?

Аказваецца, не ўсё так відавочна. Як патлумачылі на Беларускай чыгунцы, пасля адпраўлення цягніка пасажырскія праязныя дакументы, набытыя з дапамогай электроннай рэгістрацыі, раздрукоўваюць у спецыялізаванай касе. Вядома, на гэта таксама патрабуюцца расходы бланкаў і праца асобнага білетнага касіра. «Тарыфы за паслугі пры афармленні праязных дакументаў спаганяюцца згодна з пастановай Міністэрства эканомікі Беларусі ад 13 чэрвеня 2011 года №73 «Аб тарыфах на паслугі транспартных тэрміналаў», — растлумачылі спецыялісты. — Паслуга электроннай рэгістрацыі вызваляе пасажыра ад непасрэднага афармлення білета. Аднак, згодна з нарматыўна-прававымі актамі Рэспублікі Беларусь, умовай перавозкі з'яўляецца той самы праязны дакумент».

Аднак у будучыні сітуацыя можа змяніцца. Сёння Беларуская чыгунка разглядае пытанне аб адмове ад афармлення квіткоў на бланках строгага ўліку для пасажыраў, якія прайшлі электронную рэгістрацыю.

Любоў КАСПЯРОВІЧ.

СВАВОЛЬСТВА ЛЕДЗЬ НЕ ДАВЯЛО ДА БЯДЫ

У сталіцы з-за дзіцячага свавольства з агнём адбыўся пажар. Бацька выратаваў дваіх дзяцей.

Пра пажар у кватэры па вуліцы Славінскага ўдзень паведамілі суседзі. Калі на месца прыбылі пажарныя-выратавальнікі, з вокнаў жылля на першым паверсе пяціпавярховіка ішоў густы дым. Пазней высветлілася, што загарэліся дыван і абіўка канапы. Да прыезду падраздзялення МНС бацька вынес з кватэры дваіх дзетак 2009 года нараджэння. Пацярпелых шпіталізавалі з дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння». На момант здарэння ў жыллі знаходзіліся толькі бацька і дзеці, маці была на працы. Мяркуецца, што прычынай здарэння стала дзіцячае свавольства з агнём.

А вось 30-гадовы слесар пацярпеў з-за ўласнай неасцярожнасці. На тэрыторыі шынамантажу па вуліцы Альшэўскага бліжэй да вечара пры спробе распаліць вогнішча для смажання шашлыкоў пры дапамозе тэхнічнага спірту пары апошняга ўспыхнулі... У выніку мужчына атрымаў апёкі першай-другой ступеняў 27 працэнтаў цела і быў змешчаны ў бальніцу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У НАЧНЫМ КЛУБЕ ЎПАЛА СТОЛЬ

У мінулую суботу ноччу ў начным клубе «Сфера» па вуліцы Суворава ў Брэсце абрынулася навясная столь.

Інцыдэнт адбыўся на другім паверсе ў танцавальнай зале. У выніку двое наведнікаў клуба — мужчына і жанчына — атрымалі траўмы. Паводле інфармацыі ўпраўлення МНС, пацярпелым была аказана медыцынская дапамога, ад шпіталізацыі яны адмовіліся.

Работа начнога клуба прыпынена. Прычыны падзення канструкцыі высвятляюцца.

Яна СВЕТАВА.

СМАРТФОНЫ Ў... ЗАПАСЦЫ

47 папулярных смартфонаў былі схаваны ў запасным коле аўтамабіля, які быў спынены гродзенскімі памежнікамі ў пункце пропуску «Брузгі».

Гэтую партыю спрабаваў увезці з Польшчы 44-гадовы жыхар Гродзеншчыны. Пры афармленні ў пункце пропуску ён адразу ж накіраваўся на «зялёны» канал, тым самым заявіўшы, што не мае тавараў, што падлягаюць дэклараванню. Аднак памежнікі загадзя валодалі інфармацыяй аб магчымым парушэнні і таму вырашылі правесці паглыблены агляд аўтамабіля Fiat. Кошт кантрабандных смартфонаў, перададзеных супрацоўнікам Гродзенскай рэгіянальнай мытні, спецыялісты ацанілі ў 310,2 мільёна рублёў, паведамляе прэс-цэнтр Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

...СВЯТА, НА ЯКІМ ХОЧАЦЦА ЎСІХ АБНЯЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Апроч гастранамічнай, у праграме была і культурная частка. Адкрыў вечар нязменны вядучы фэсту, лідар гурта «Палац» Алег Хаменка. Затым выступілі «Аляксандра і Канстанцін» з прэзентацыяй новага дыска «М1», Ірэна Катвіцкая, якая прадставіла музычную праграму «Этнафантазія», і гурт GUDA. Пасля гэтага гасцям паказалі першую частку фільма Аляксея Раковіча «Гісторыя беларускай страўні». Стужка, у якой вельмі ўдала спалучыліся мастацка-гістарычныя замалёўкі з наглядными рэцэптамі нацыянальных мясных страў, аказалася сапраўды «смачнай». Пасля яе прагляду пацяклі слінкі, нягледзячы на тое, што напачатку гледачы добра падсілкаваліся. Але музычны хэдлайнер вечара гурт Shuma спалучэннем архаічных спеваў з электроннай музыкай прымусіў публіку забыцца на голад і пусціцца ў скокі. Калі канцэрт скончыўся, аўтобусы на Мінск ужо не хадзілі, і каб не дзяўчаты з GUDA, якія ехалі на машыне, карэспандэнту «Звязды» выпала б унікальная магчымасць правесці ноч у музеі пад адкрытым небам і пабачыць падрыхтоўку да асноўнага дня фестывалю з самага яе пачатку.

Але пашчасціла вярнуцца дадому і прыехаць у Азярцо на наступны дзень. Ён таксама быў для ўсіх у пэўнай ступені сюрпрызам: загадзя былі абвешчаны замежныя хэдлайнеры, якіх сёлета было некалькі (звычайна прыязджаў толькі адзін іншаземны госць), і час, калі пачнецца асноўная праграма, — 12.00. А вось з самім раскладам выступаў можна было пазнаёміцца непасрэдна ў дзень канцэрта на месцы.

Некаторыя з задавальненнем паспрабавалі сябе ў ганчарстве.

Нягледзячы на інтрыгу, народу ў беларускім скансэне большала з кожнай гадзінай. І не дзіўна: за пяць гадоў «Камяніца» набыла шмат прыхільнікаў. Бо на фэсце можна не толькі пабачыць і паслухаць як вядомыя прафесійныя, так і аматарскія фолк-калектывы з Беларусі і замежжа. Тут, на вольным паветры, сярод аўтэнтычных збудаванняў мінулых стагоддзяў, прывезеных з усёй краіны, як нідзе можна адчуць гістарычную і нацыянальную еднасць людзей. Спрыяе гэтаму і тое, што многія наведнікі фестывалю прыязджаюць у нацыянальных касцюмах (такі «дрэс-код» даваў права ў другі дзень прайсці на мерапрыемства бясплатна). І такая любата адкрываецца вачам: дарослыя і дзеці ў сялянскіх і шляхецкіх строях, безліч вышыванак, андаракаў, паясоў розных часоў, мясцовасцяў, аздаблення...

Майстар-клас па вырабе традыцыйных лялек захапіў дзяцей.

Аляксей толькі адзін раз прапусціў «Камяніцу», і сёлета спецыяльна пазычыў у знаёмага кашулю на фэст. Сама яна хоць украінская, але падобная да тых, што былі ў нас на Палессі, але самае галоўнае — яна аўтэнтычная, вышытая не пазней за пасляваенны час. Сяброўка Аляксея Маша таксама красавалася ў аўтэнтычнай доўгай кашулі з тканым поясам. «Знаёмы набыў хату пад Барысавам, і, разбіраючы там старыя рэчы, знайшоў сярод іх некалькі ручнікоў, кашуль і пояс — ён і адна з кашуль на Машы», — распавёў хлопец.

«О, «Звязду» мае бацькі выпісваюць! — паведаміў мне яшчэ адзін з суразмоўцаў, які быў таксама ў вышыванцы (у якой, як прызнаўся, браў шлюб) і трымаў на руках бялявага кучаравага хлопчыка.

— Мяне Віктар завуць, а гэта — Станіслаў Віктаравіч, яму два гады, — адрэкамендаваўся мужчына.

Віктар на фэсце ўжо трэці раз, упершыню з жонкай узялі з сабой сына. «Усё цудоўна, прыемна, што тут збіраецца шмат беларускамоўных людзей, што яны прыходзяць з дзецьмі».

У такой прасякнутай беларускасцю атмасферы нават не хацелася злавацца на тое, што замест 12 гадзін музычная праграма пачалася значна пазней за 14. Ды і заняцца ў гэты час было чым. Напрыклад, агледзець экспазіцыю музея і пазнаёміцца з побытам нашых продкаў у розных рэгіёнах Беларусі. Або набыць свістульку, тканы паяс, упрыгожанні ў фолк-стылі і шмат што іншае на кірмашы рамёстваў, навучыцца старадаўнім танцам. Апроч гэтых ужо традыцыйных забаў сёлета на фэсце з'явілася некалькі новых пляцовак: можна было пастраляць з лукаў і арбалетаў, паўдзельнічаць у майстар-класах па ганчарстве, вырабе традыцыйных лялек, агледзець мастацкія і фотавыставы і нават убачыць упершыню выстаўлены ўсіх абняць! — падзялілася пасля выступу салістка гурта Ярына Квітка. — Заўжды, калі едзеш на фестываль, нешта сабе фантазіруеш, спрабуеш прадказаць паводзіны публікі. Мы ведалі, у якім месцы будзем выступаць, прыкладна здагадваліся, як нас сустрэнуць. Але ўсё адно, калі прыехалі, усе нашыя фантазіі развеяліся. Кожная асоба індывідуальная і аддае сваю цеплыню і энергетыку, і пасля такога ўзаемаабмену ты адчуваеш сябе шчаслівым».

Калі канцэрт скончыўся, аўтобусы на Мінск ужо не хадзілі, і каб не дзяўчаты з GUDA, якія ехалі на машыне, карэспандэнту «Звязды» выпала б унікальная магчымасць правесці ноч у музеі пад адкрытым небам і пабачыць падрыхтоўку да асноўнага дня фестывалю з самага яе пачатку.

Пасля «Фолкнеры» на сцэну выйшаў калектыў з Польшчы Orkiestra Sw. Mikolaja, разнастаіўшы фестывальную атмасферу гучаннем акустычных інструментаў. «Мы пад вялікім уражаннем, тут добрае, прыгожае месца, — адзначыў вакаліст гурта Багдан Браха, шкадуючы, што не хапіла часу агледзець усю музейную прастору. — Мы цэнім беларускую фальклорную музыку, а яшчэ тут файная публіка і асаблівая атмасфера».

Тым часам канцэртную праграму перапыніў традыцыйны конкурс на лепшую пару ў нацыянальных строях, пераможцы якога, муж і жонка, атрымалі магчымасць бясплатна наведаць рэстаран. «Тады мы адзначым у вашым рэстаране трэція ўгодкі нашага вяселля!», — паабяцаў мужчына.

Пасля конкурсу нарэшце на сцэне з'явіліся тыя, каго, бадай, чакалі болей за ўсіх — украінскі этна-хаос-гурт «ДахаБраха». Яны напоўнілі «Камяніцу» аўтэнтычнымі ўкраінскімі песнямі, пакладзенымі на фолк-музыку розных народаў свету. Пасля таго, як музыкі выканалі некалькі кампазіцый, публіка пачала скандаваць: «Да-ха-Бра-ха!», просячы выступу на біс, аднак гурт вымушаны быў адмовіць, бо яго ўдзельнікі маглі спазніцца на цягнік...

Са шкадаваннем гледачы адпусцілі ўкраінцаў і падрыхтаваліся да сустрэчы наступнага хэдлайнера. Ім стаў гурт з Расіі Hvarna. Адным з яго заснавальнікаў з'яўляецца беларус Андрусь Палаўчэня, вядомы па праекце OSIMIRA, які ўдзельнічаў у «Камяніцы» ў 2011 годзе. Hvarna паказалі цэлую тэатральную дзею з маскамі і маляваннем пясчаных карцін, але крыху закалыхалі гледачоў. Разварушылі публіку (ды так, што ля сцэны стала спякотна ад скокаў) гаспадары

На сцэне гурт «Фолкнеры» з Украіны.

фэсту — «дарослай», на якой ішлі рэпетыцыі прафесіянальных гуртоў, і «дзіцячай», дзе рыхтаваліся да выступаў юныя ўдзельнікі фолк-калектываў з розных куткоў краіны. Летась, калі дзве сцэны знаходзіліся на розных пляцоўках даволі далёка адна ад адной, выступы на іх ішлі паралельна, і пабачыць усё было фізічна немагчыма. Сёлета ж сцэны паставілі побач, і выступы на іх чаргаваліся: пакуль ішла падрыхтоўка вялікай сцэны, працавала малая, і наадварот. Дарэчы, калі на мінулым фэсце выступілі 157 дзяцей, то на гэты было адабрана ўсяго некалькі дзіцячых калектываў.

Сведения о земельном участке: 177/1000 доли в праве постоянного пользования на земельный участок, пл. 0,0514 га предоставленного для обслуживания жилого дома.

ЛОТ № 2: производственная база, расположенная **по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, г. Брест, ул. Карасева, 100**, в составе: растворный узел, об. пл. 498,7 кв.м; котельная 488 кв.м (в т.ч. оборудование котельной согласно Перечня); бытовые помещения на 90 человек, об. пл. 410,7 кв.м; механическая мастерская, об. пл. 968,5 кв.м; склад сухих лесоматериалов, об. пл. 501,7 кв.м; гараж автоколонны, об. пл. 798,2 кв.м; навес к складу, об. пл. 430 кв.м; пристройка к пилораме, об. пл. 348,3 кв.м; материальный склад № 1, об.пл. 315,9 кв.м; проходная будка, об.пл. 15,7 кв.м; паровая лесосушилка, об. пл. 71,5 кв.м; склад сыпучих материалов, об. пл. 126,3 кв.м; механический склад цемента, об. пл. 45,2 кв.м; здание КНС, об. пл. 46,1 кв.м; материальный склад № 2, об. пл. 368,1 кв.м; здание компрессорной станции, об. пл. 62,4 кв.м; здание для хранения материалов (кладовки), об. пл. 200 кв.м; навес для кислородных баллонов, об. пл. 28,1 кв.м; повышенный путь; бетонный полигон; хранилище для битума; помещение хозяйственного назначения, об. пл. 34 кв.м; в т.ч. тепловые сети, наружный водопровод, мачты освещения метал. 2 шт; мачты освещения метал. 5 шт; линия электропередач 240 мп; канализация.

Начальная цена с НДС – 17 867 714 066 бел. руб.

Площадь земельного участка для обслуживания производственной базы – **3,6287 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Для обслуживания повышенного пути продавцу на праве постоянного пользования предоставлен земельный участок **0,6699 га.** Обременение: частичная аренда.

Задаток 5% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **5** (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.08.2013.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **10 октября 2013 г.** в **10.00** по адресу: **г. Минск, ул. Советская, 8.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09 октября 2013 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

Пуховичское районное потребительское общество

СООБЩАЕТ О ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩИХ ОБЪЕКТОВ, расположенных в Пуховичском районе Минской области:

- **МАГАЗИН в д. Мижречье, д. Любячка, д. Тешково;**
- **ЗАГОТОВИТЕЛЬНЫЙ ПУНКТ в д. Турин;**
- **СКЛАД в аг. Пуховичи.**

Получить всю необходимую информацию о продаже вышеуказанных объектов вы можете **по тел. (01713) 41 1 42, 42 4 94.**

УНП 600115965

СВАЁ — ЗНАЧЫЦЬ ЛЕПШАЕ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Селекцыйнай работай па такіх культурах беларускія агароднікі звычайна не займаліся, бо яшчэ з часоў СССР нашы намаганні былі скіраваны на работу з холадаўстойлівымі раслінамі. Таму распрацоўку тэхналогіі вырошчвання кавуноў у рамках праграм імпартазамяшчэння мы праводзілі на 50 ранняспелых гатунках з Галандыі, Украіны і ЗША, з якіх былі выбраны і рэкамендаваны нашым вытворцам 4 гібрыдныя гатункі, што маюць сапраўдны кавуновы смак і, асабліва падкрэслю, могуць захоўвацца да 30 дзён, а важыць кожны кавун ад 7 да 15 і больш кілаграмаў. Паводле доследаў, цяпер мы дакладна ведаем, якія гатункі найлепшыя і як іх разводзіць. Ніякай спецыяльнай тэхнікі для гэтага не патрабуецца, тэхналогія нескладаная. Яшчэ чатыры гады таму кавуны займалі 5 гектараў, сёння — больш за 100, прычым плошчы пашыраюцца як на прыватных і фермерскіх падворках, так і ў сельгаспрадпрыемствах. Вось таму стратэгічнасць гэтай культуры якраз і палягае на тым, што ў гаспадарцы не «гуляе» нават няўдобіца, а пакупнік мае наш, беларускі прадукт... Зразумела, вырошчваць цыбулю ці часнок выгадней, але там, дзе паспяхова расце кавун, не расце больш амаль нічога...

— Але пакуль што спажывецкі попыт задавальняецца гэтым прадуктам з поўдня Расіі ды азіяцкіх краін...

— Упэўнены, што гэта толькі справа часу, і часу недалёкага. Тыя, хто вырошчваюць кавуны, рэалізуюць іх пакуль што паблізу ад сябе, пакупнікам мала вядомыя кавуны беларускія, але ахвотныя могуць атрымаць у нашым інстытуце ўсе неабходныя парады. Усё складваецца добра, але не вырашана пакуль як след пытанне забеспячэння фермераў і сельгаспрадпрыемстваў насеннем, бо яго пастаўшчыкі прапануюць вялікія партыі, а кожны гаспадар хоча пачынаць справу доследным шляхам, з невялікіх плошчаў. Але гэта справа вырашаецца.

Зразумела, вырошчваць цыбулю ці часнок выгадней, але там, дзе паспяхова расце кавун, не расце больш амаль нічога...

— Чым яшчэ ўзбагацяць стол беларускія агароднікі?

— Навукоўцы вядуць цяпер паспяховую адаптацыю да нашых умоў некалькі гатункаў дыні, аднак яе высокая цеплалюбівасць пакуль дае нам шанс паспрабаваць толькі цяплічныя варыянты. Акрамя таго, вырошчванне дыні вымагае і выкарыстання пестыцыдаў, але культура гэтая перспектыўная, хай сабе і для прыватных альбо невялікіх фермерскіх гаспадарак. Гатовы мы прапанаваць таксама цыбулю-парэй, многія гатункі капусты брокалі, кальрабі, пекінскай, савойскай, духмяныя травы і прыправы. Нават вырашчаныя на невялікіх плошчах, яны ў стане прынесці добры прыбытак гаспадарам і замяніць замежныя аналагі. Мне здаецца, што найбольш перспектыўнае развядзенне гэтай «экзотыкі» для невялікіх гаспадарак і фабрык, для падсобных гаспадарак, кансервавых заводаў і мясакамбінатаў.

Уласная «сярдзітасць»

Меркаванне вучонага падтрымліваюць і ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання. Паводле слоў Таццяны Карбановіч, начальніка аддзела па вытворчасці і гандлі плодагароднай прадукцыяй, экзатычныя, альбо малараспаўсюджаныя культуры, робяцца штогод на нашых нівах усё больш сваімі. Напрыклад, гаспадар Уладзімір Крапіўка са Смалявіцкага раёна вырошчвае лекавыя і духмяныя травы, цыбулю, баклажаны, часнок — да 40 розных відаў пладоў і агародніны, мае ўласную фасовачную вытворчасць і выдатна гандлюе, падаючы іншым прыклад.

Як і ў гэтым выпадку, вялікае заўсёды пачынаецца з малога. Таццяна Карбановіч упэўнена, што яшчэ ўчора мала распаўсюджаныя ў нас культуры сёння робяцца ўсё больш папулярнымі. А пад канец года падлічым ураджай! Безумоўна, фірму па вырошчванні хрэну альбо ароніі спецыяльна ствараць, магчыма, і не трэба, але што людзі пачалі вырошчваць яе — здабытак!

Зусім нядаўна ў нашых крамах мы маглі набываць хрэн толькі польскай вытворчасці. Прадукт быў добры, але палякі яго рабілі надта лагодным, часам — занадта разведзеным і ненасычаным. Справа, натуральна, не ў смаку і вастрыні, а ў прынцыпе — таму і ўзнікла пытанне, а чаму не маем на паліцах нашага хрэну? Расце ж ён на кожным агародзе. Мінула колькі гадоў — і маем уласны, рознай «сярдзітасці» прадукт. Актыўна ім заняліся на Гродзеншчыне, на Палессі — і пытанне вырашылася. Тое самае адбылося з журавінамі — сімвалам краіны, з ароніяй (чарнаплоднай рабінай), цукровай кукурузай. Праз год-два, лічаць спецыялісты, будзем спажываць уласнай вытворчасці замарожаныя сумесі агародніны. Кошты іх у нашых крамах, мякка кажучы, пакуль што выклікаюць здзіўленне: перац, капуста, шампіньёны, бульба, замарожаныя паасобку, каштуюць небагата, але сумесі іх ад замежных вытворцаў куды даражэй. Пакуль што фермерам нашым гэта, магчыма, не пад сілу, але дзяржпрадпрыемствы павінны падтрымаць сваіх вытворцаў.

Пятро РАМАНЧУК.

■ На кантролі

Завысілі кошт на 200 мільёнаў

У ходзе праверкі дзейнасці аддзела адукацыі, спорту і турызму Камянецкага райвыканкама, праведзенай Камітэтам дзяржкантролю Брэсцкай вобласці разам з упраўленнем унутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама, было выяўлена парушэнне заканадаўства аб дзяржаўных закупках.

Як паведаміў супрацоўнік Дзяржкантролю Уладзімір Белавусаў, дзяржаўнай маёмасці быў нанесены ўрон на суму 200 мільёнаў рублёў пры выкананні работ па рамонце школьных аўтобусаў. Падрадчык неабгрунтавана завысіў кошт работ. Высветлена, у прыватнасці, што інфармацыя аб правядзенні працэдуры дзяржаўнай закупкі ва ўстаноўленым парадку апублікавана не была, не працавала як след конкурсная камісія. Акрамя таго, рамонт аўтобусаў для перавозкі дзяцей правадзіўся прыватным прадпрыемствам, якое не мае сертыфіката адпаведнасці на гэту катэгорыю работ. А вось працаёмкасць рамонту яны завысілі недзе ў чатыры разы.

Яна СВЕТАВА

■

■ Спорт

ДЭЖАВЮ ВІКТОРЫІ АЗАРАНКІ І ЛЁГКАЯ ПРАГУЛКА БЕЛАРУСКІХ ФУТБАЛІСТАЎ

У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра тое, якая падзея «падсаладзіла» паражэнне Вікторыі Азаранкі ў фінале US OPEN, ці адчувае ціск Аляксей Калюжны, выступаючы за «Дынама», і дзе адбудзецца летняя Алімпіяда ў 2020 годзе.

1. Вікторыя Азаранка не здолела перамагчы Сірэну Уільямс у фінале Адкрытага першынства ЗША па тэнісе. У матчы за тытул беларуска **прайграла з лікам 5:7 7:6 1:6.**

Паядынак дзвюх лепшых тэнісістак планеты хутчэй нагадваў бітву характараў, а не звычайны тэнісны матч. У першым сэце спартсменкі вырашалі, хто будзе дамінаваць у сустрэчы. І ў апошні момант на свой бок «канат перацягнула» амерыканская тэнісістка. У другой партыі Уільямс заканамерна хутка зарабіла перавагу і нават падавала на матч, але Вікторыя, дэманструючы фенаменальную хватку, зраўняла лік, а затым і вырвала перамогу ў другім сэце. Але такі марш-кідок не мог не адбіцца на стане беларускі. У ключавыя моманты вырашальнай партыі Вікторыя стала дапускаць памылкі, што дазволіла амерыканскай саперніцы ўпэўнена давесці матч да перамогі.

Пасля паядынку Вікторыя адзначыла: «Гэта цяжкае паражэнне, але выйсці ў фінал і гуляць супраць лепшай тэнісісткі свету было прыемна. Мы абедзве адчайна змагаліся і аддалі ўсе сілы на корце. Застаецца толькі павіншаваць Сірэну. Магу сказаць адно: я прайграла вялікай чэмпіёнцы, так што апускаць галаву не буду». Нагадаем, летась Вікторыя Азаранка таксама ў трох сэтах саступіла Сірэне Уільямс у фінале US OPEN.

Тым не менш у беларускіх прыхільнікаў тэніса ёсць падставы для радасці. Тытул у спаборніцтвах змешаных пар заваяваў Максім Мірны. У фінале US OPEN беларуска-чэшскі тандэм Максім Мірны/Андрэа Хлавачкава перайграў амерыканку Эбігейл Спірс і мексіканца Санцьяга Гансалеса. Для беларускага тэнісіста гэта чацвёртая перамога ў міксце на турнірах Вялікага шлема. Раней ён дамагаўся поспеху ў пары з Серэнай Уільямс і Вікторыяй Азаранкай.

2. Беларуская футбольная зборная ў таварыскім матчы перамагла каманду Кыргызстана 3:1. Галамі адзначыліся Сяргей Балановіч, Віталь Радзівонаў і Раман Сітко. Пасля матча **настаўнік беларускай каманды Георгій Кандарцьеў** пракаментаваў дзеянні сваіх падапечных: «У другім тайме быў нейкі сумбур. Напэўна, усё ўпіраецца ў псіхалогію: вялі 2:0, падумалі, што перамога ўжо ў кішэні, — у выніку прапусцілі недарэчны гол. Спадзяюся, што ў матчы з французамі такога не паўторыцца». Нагадаем, матч адборачнага цыкла да чэмпіянату свету 2014 года супраць зборнай Францыі адбудзецца сёння на гомельскім стадыёне «Цэнтральны».

Каб перамагчы кыргызаў беларускім футбалістам час ад часу прыходзілася выконваць ледзь не акрабатычныя нумары.

Фота Надзеі БУЖАН.

3. У першым хатнім матчы КХЛ **«Дынама» (Мінск) у авертайме саступіў маскоўскаму ЦСКА — 1:2.** Адзіная шайба, закінутая ў вароты Расціслава Станя, на рахунку Артура Гаўруса. У масквічоў вылучыліся Мікалай Прахоркін і Георгій Мішарын.

Дарэчы, у складзе бела-сініх на лёд выходзіў Аляксей Калюжны, які напярэдадні падпісаў кантракт з мінскім клубам. Апошняя «прапіска» беларускага хакеіста — яраслаўскі «Лакаматыў».

Пасля матча Калюжны адзначыў, што не адчувае дадатковага ціску з-за надзей, якія на яго ўскладаюцца. «Мне 36 гадоў. Толькі гэта можа мяне непакоіць, — іранічна пракаментаваў хакеіст. — Я прыехаў атрымліваць задавальненне і асалоду ад хакея. Акрамя іншага, у камандзе разлічваю добра падрыхтавацца да хатняга чэмпіянату свету».

Ужо сёння на «Мінск-Арэне» «Дынама» правядзе матч супраць славацкага «Слована».

4. У Буэнас-Айрасе выбралі сталіцу летняй Алімпіяды-2020. **Гонар прыняць 32-я летнія Алімпійскія гульні выпаў Токіа.** На правядзенне Алімпіяды таксама прэтэндавалі Мадрыд і Стамбул. Пасля першага тура галасавання з алімпійскай гонкі выбыла іспанская сталіца. У другім туры з абсалютнай перавагай у 24 галасы перамога дасталася Токіа. Апошні раз сталіца Японіі прымала летнія Алімпійскія гульні ў 1964 годзе. Дарэчы, на гэтай сесіі МАК прыняў яшчэ адно важнае рашэнне — у алімпійскую праграму вярнулі барацьбу.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

НАШ ТРЭНЕР — НАЙЛЕПШЫ Ў РАСІІ

Беларускага футбольнага спецыяліста Леаніда Кучука прызналі лепшым трэнерам жніўня ў расійскай прэм'ер-лізе.

У галасаванні названне лепшага трэнера Леанід Кучук абышоў Лучана Спалеці і Курбана Бердыева.

Нагадаем, у чэрвені Кучук заняў месца Славена Біліча на пасадзе галоўнага трэнера маскоўскага «Лакаматыва». Да пераходу ў «Лока» беларус узначальваў футбольны клуб «Кубань». Пад кіраўніцтвам Кучука «казакі» не прайгралі ніводнага матча ў вясенняй частцы чэмпіянату і, мала таго, выйшлі ў еўракубкі. Зразумела, такі прыкметны поспех не мог не зацікавіць кіраўніцтва «чыгуначнікаў», якія відавочна знаходзіліся ў крызісе.

Але казаць пра тое, што Кучук вывеў каманду з тупіка, пакуль рана. Тым не менш якасныя змяненні ў выніках чырвона-зялёных нельга не заўважыць. У жніўні «Лока» правёў тры матчы і набраў дзевяць ачкоў, забіў дзевяць мячоў, прапусціўшы пры гэтым толькі адзін! Прычым перамогі былі здабыты ў гульнях з далёка не апошнімі клубамі расійскага чэмпіянату — «Краснадарам», «Растовам» і «Церакам». Растаўчане, якія нечакана лідзіравалі ў першых турах, увогуле былі разгромлены — 0:5.

Такога зараду ўпэўненасці каманда не дэманстравала даўно. Зараз «Лакаматыў» знаходзіцца на пятым месцы ў турнірнай табліцы расійскага чэмпіянату па футболе, ушчыльную падабраўшыся да лідараў — «Растова», «Зеніта» і «Спартака» (ЦСКА, з 17 ачкамі знаходзіцца на першым радку) і пакуль што па-за канкурэнцыяй. Цікава будзе паназіраць, ці атрымаецца ў беларускага спецыяліста канчаткова ўскалыхнуць «Лакаматыў».

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

■ Асаблівасці «ціхага» палявання

А ВЫ ЗБІРАЛІ ЧЫРВОНАГАЛОВІКІ... БЕГМА?!

У нашай сям'і лічаць: тое, што наша, нам і застанецца. Пры любых умовах. У дачыненні да грыбоў гэта дзейнічае так: колькі б людзей ні прайшлося па «нашых» грыбных мясцінах, з пустымі рукамі мы ніколі не вернемся! І размова ідзе не пра адзін-два грыбкі на дне вядзерца... «Норма» была заўсёды! Вось пройдзе іншы грыбнік, а ты ідзеш за ім літаральна след у след і... падымаеш баравікі. Прычым не скажаш, што ён — разява... Проста «наша — нам» насамрэч працуе.

...Гэтым разам у мясціны, дзе «водзяцца» чырвонагаловікі, выправіліся па абедзе — зранку былі неадкладныя справы. Зразумела, што і іншыя аматары грыбоў таксама ўжо не спалі ў шапку! Літаральна ў самым пачатку лесу мы згледзелі веласіпед. А вось яго ўладальніка нідзе не было відаць.

Супакоіўшы сябе тым самым, звыклым «наша — нам», разыходзімся з татам у розныя бакі, імкнучыся, каб пад нагамі не хрусцелі галіны. Гэта досыць цяжка, бо лаўжоў і буралому пасля ўраганаў мінулых гадоў у лесе — процьма! Цікава, што і некаторыя чырвонагаловікі аблюбоўваюць менавіта «звалку галін»...

Сёння першы грыб — мой! Ага, працягваюць расці. Гэта прыемна. Так атрымалася, што падчас паходаў па грыбы ў гэтыя мясціны я раблюся спецыялістам па маленькіх чырвонагаловіках, у асноўным іх «цягаю», а тата — па вялікіх.

Гэтак жа складвалася і ў гэты дзень. Я натрапіла на адпаведны «пятачок», на якім, нягледзячы на чырвонае лісце, апалае з дрэў, добра былі відаць грыбы. Хаця сітуацый, падчас якіх здалёк прымаеш ліст за грыб, таксама хапала...

Сыходзіць з той мясцінкі не хацелася, ды тата пачаў настойліва клікаць да сябе. Іду на голас — і бачу побач з ім уладальніка веласіпеда. Той зазначае: «Во, пайшлі чырвонагаловікі! А дагэтуль не было!» Ага, значыць, і ён даўно ўжо аблюбаваў гэты ўчастак лесу... Затым грыбнік кажа, што аднёс ужо сабранае да веласіпеда і ідзе па грыбы другі раз. Дзівак чалавек! А раптам хто возьме пакінутае?! Гэта ж не ў машыне замкнуць...

А тата, аказваецца, клікаў мяне, каб паказаць, як растуць на невялікай адлегласці пяць вялікіх прыгажуноў. Але, пачуўшы набліжэнне канкурэнта, хуценька іх зрэзаў. Непадалёк знайшла яшчэ аднаго — ладнага — і я...

Так мы і шпацыравалі па лесе ўзад ды ўперад, «прачэсваючы» мясцовасць. Пакеты паціху напаўняліся. Цікава, што ў гэты дзень чырвонагаловікі знаходзіліся не па адным, а па тры адразу! Тата нават адшукаў некалькі старых баравікоў. Павесіў на дрэва — няхай споры рассявае вецер. Натрапіў і на адзін добры. А я і ўвогуле знайшла цуд — два баравічкі, якія зрасліся бакамі. Ух ты! Абсалютныя блізняты! Шкада толькі, што аказаліся трохі чарвівымі. Але ж затое любавалася я імі ў пакеце, пакуль хадзіла па лесе!

Чамусьці ўвесь час атрымліваліся так, што наш «калега» ішоў папарадзе, куды ні звярні. А напачатку ён сабраў ладную колькасць чырвонагаловікаў акурат на ўзлеску! Вось і далёка ад лясной утравянелай дарогі адыходзіць нікуды не трэба... Дзіва, ды і толькі! Падняла там некалькі грыбоў і я.

Затым мы з татам вырашылі перайсці ў другое па ліку «наша» месца. Вой-ёй! Што пачалося! Ды тут жа ніхто і не быў! Чырвонагаловік, яшчэ адзін, і яшчэ... Паглыбляюся ў лес... О, вунь грыб! А там — другі. А там — трэці. У літаральным сэнсе разбягаюцца вочы!!! Хутчэй, хутчэй зразаць! Бегма — ад аднаго да другога, па дарозе клічучы тату...

О, вунь грыб! А там — другі. А там — трэці. У літаральным сэнсе разбягаюцца вочы!!! Хутчэй, хутчэй зразаць! Бегма — ад аднаго да другога.

Калісьці, яшчэ малой, накіраваўшыся ў лес з мамай і старэйшым братам, на нашай грыбной паляне я згледзела пяць вялізных чырвонагаловікаў. Бегала ад аднаго да другога, паспешліва зразаючы. А пасля на ўсёй хуткасці панеслася да сваіх, хваючы «здабычу» за спіною, каб пасля ўрачыста прадэманстраваць «букет» чырвонагаловікаў!

Гадоў трыццаць прамінула з таго часу. А я ўсё гэтак жа (у сваім узросце!) — бегма па грыбы. І гэтым разам у адным месцы іх было не пяць, а дваццаць! Прызнаюся шчыра: ніколі ў жыцці яшчэ так не «палявала». Ух, горача! І цяжка насіць «здабычу»...

А напарадзе — такія прыгожыя грыбныя мясціны! Зноў разыходзімся ў розныя бакі. І зноў літаральна «скачуць», каб трапіць у поле зроку, чырвонагаловікі. Рознага памеру — маленькія, сярэднія, вялікія. Так, пакеты (іх у руках ужо — два) — на зямлю. І — што?! Правільна, ад аднаго да другога грыба — бегма, клічучы тату і гучна здзіўляючыся кожнай новай знаходцы, якая, здаецца, імгненна «вырастае» пад рукамі.

У пакетах месца няма. У чаканні таты з яго вялізным пакетам «складзірую» ў кучку. Уф! Дваццаць чатыры штукі — за пяць хвілін бегу. І — мокрая, што мыш! Цікава, колькі грамаў вагі скінула?!

З цяжкай ношай накіроўваемся да дачнай сядзібы. Там перакладваем грыбы ў вёдры, звыкла загружаем машыну бульбай, памідорамі, цыбуляй ды часнаком. Тэхніка «брыкаецца», але цягне.

А дома мама ў вялікім здзіўленні бярэцца за шчокі! Усё бачыла ў сваім жыцці. У дзяцінстве ў роднай вёсцы Яўкіна, што на Смаленшчыне, па столькі цягалі яны з братамі ды іншыя вясковыя дзеці баравікоў. А вось чырвонагаловікі ў такой колькасці і яна бачыць упершыню.

Так, машыну — у гараж, грыбы — на стол, самі — вакол, з нажамі. «Ашкурваем» ножкі, рэжам іх і шапачкі, кідаем у падсоленую ваду. І зноў — практычна ніводнага чарвівага грыба! Толькі пагрызеныя слімакамі трапляюцца. Але гэта — дробязі жыцця. Выразаем...

Рукі так і мільгаюць, бо справа рухаецца да ночы. Але за дзве гадзіны ўтраіх — справіліся! Крыху прамыць, адварыць, пасаліць — і ў каструлях на лоджыю да заўтра. А пасля — даварыць, закруціць і замарозіць. Вось толькі дзе знайсці столькі месца ў лядоўні, калі там — запас ягад на ўсю зіму?!

...Ледзь не цэлую ноч я «бегала» па грыбах, а тады іх «ашкурвала»! І ў сне яны мяне не адпускалі...

Святлана АДАМОВІЧ.
Фота аўтара

■

■ Мясціны, знітаваныя з душой

Кнігі «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі» знайшлі сваіх уладальнікаў

Паважаныя аматары даўніны, краязнаўцы! Як і абяцалі, на пачатку верасня мы падводзім вынікі нашага конкурсу. У рэдакцыю прыйшло даволі шмат лістоў пра невялікія мястэчкі, славутых асоб, адметныя гістарычныя падзеі ў жыцці рэгіёнаў. Лепшае з напісанага трапіла на старонкі газеты.

Было надзвычай прыемна пасля публікацыі тэкстаў атрымліваць вашы ўдзячныя водгукі, словы пра тое, што вы ўсёй вёскай ці раёнам скупляеце газету, каб прачытаць і, пэўна, захаваць на доўгі час словы пра дарагія вам месцы.

Каб прыняць рашэнне, хто ж аказаўся найлепшым у гэтым конкурсе, было склікана журы. Вызначаны тры найлепшыя тэксты і аўтары — гэта «Загадка старога дома, або Як у Баранавічах уратавалі Пілсудскага» **Таццяны Грынкевіч,** «Царква... стала мостам» **Соф'і Кусянковай** і «Летнікі для багацеяў. У Маёнтку» **Марыі Храмлюк**. Паважаныя аўтары, кожны з вас узнагароджваецца адным з трох вялікіх ілюстраваных альбомаў выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Гэта «Полацк. 1150», «Д. Струкаў. Альбом малюнкаў. 1864—1867» і «Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава. 1911—1912». Просім пераможцаў звязацца з рэдакцыяй (тэлефон 8 017 292 31 21, Ніна Шчарбачэвіч, вядучая творчага праекта «Ігуменскі тракт»), каб дамовіцца пра атрыманне гэтых каштоўных выданняў і падарункаў ад газеты «Звязда». Урачыстае ўзнагароджванне адбудзецца ў рэдакцыі газеты.

Аднак на гэтым мы не будзем ставіць кропку. Наша гісторыка-культурная спадчына, вашы, з любоўю да сваёй малой радзімы зробленыя даследаванні, павінны даходзіць да шырокага кола чытачоў. Таму конкурс «Мясціны, знітаваныя з душой» працягваецца. Як і раней, работы дасылайце на паштовы адрас газеты: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда» або на электронны адрас: igumenski@mail.ru з пазнакай «Мясціны, знітаваныя з душой». Аб'ём тэкстаў — да 5 тысяч знакаў. Падвядзенне вынікаў будзе прымеркавана да наступнага Дня беларускага пісьменства.

Дарагія нашы чытачы і аўтары! Мы будзем рады атрымаць вашы новыя работы. Нас цікавіць тое, што знайшлі, даведаліся менавіта вы. І не забудзьцеся расказаць, чаму гэтыя мясціны ці асобы знітаваныя з вашай душой, якія яе струны закранае тое, пра што вы пішаце. Будзем разам адкрываць гісторыю нашай краіны і для сябе, і для сваіх землякоў.

■ Карані

МОДА НА «ЭТНА»

Пераймальнікі народнай культуры едуць у глыбінку

«Вой, хачу, хачу!..» Я ледзь стрымлівала сябе, каб не падысці і не кінуцца прымяраць ільняную кашулю. Нават на адлегласці было зразумела: ёсць у ёй тое, чым не можа крануць ніводная модная сучасная шмотка — дух. Мо таму, што нейкую вельмі адмысловую вышыўку выкарыстала майстрыха, калі яе ўпрыгожвала: малюнак шчыльна запоўнены швом, каб «зафарбаваць» элементы. І такіх прывабных рэчаў побач было шмат — ручнікі, посцілкі, спадніцы, андаракі... Усё прывезена з экспедыцыі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства ў Горацкі раён Магілёўскай вобласці.

А паслухала ўдзельнікаў, дык колькасць «хачу» перавысіла ўсе магчымасці гарадскога жыхара: не, такое не купіш. Гэта можна толькі адшукаць — як скарб, як каштоўнасць, якую можна, вядома, зберагчы, схаваўшы ад вачэй. Вось толькі ў гэтых каштоўнасцяў ёсць наканаванне — яны ствараліся для вачэй (каб тыя, хто гэта носіць, радавалі тых, хто на іх глядзіць), а значыць, павінны працягваць радаваць. Не толькі як цуда-творы вясковых майстрых, але і як рэчы, якія можна выкарыстоўваць і цяпер. Ведаць толькі, як...

Дык жа і едуць па гэта. Тыя, да каго прыязджаюць, здаецца, толькі і чакаюць, з кім падзяліцца тым, што ведаюць і ўмеюць рабіць. Скарб сабраны багаты: паданні, легенды, абрады, вераванні, песні, рамёствы...

ПЕРАДАЧА АГНЮ

Мясцовыя людзі ў першыя ж дні здзівілі тым, што былі неверагодна адкрытыя для гутарак, адразу гатовыя заспяваць, па першай жа просьбе, нават «цяжкае» пахавальнае галашэнне прадэманстраваць. Наогул нечакана шмат спявалі ў гэтым раёне: нікога не трэба было «раскручваць» на песні. У выніку запісана шмат матэрыялу, які змогуць потым выкарыстаць фальклорныя гурты. Ды і проста так вывучыць і спяваць можна. Так танчыць, як у Горацкім раёне, цяпер не праблема. Мала таго, што рухі асобныя засвоілі проста на месцы, дык гэтыя рухі яшчэ былі пад гармонік! Нават два гарманісты сустрэліся падчас экспедыцыі. Дзеля таго, каб адразу пераняць іх музычную манеру, спецыяльна выклікалі з Мінска на дапамогу Аляксея Крукоўскага, які выступае з капэлай.

Але ж яшчэ вельмі цікавы пласт нематэрыяльнай культуры — абрады.

— Вясельны абрад запісаны досыць поўна, — дзеліцца ўражаннямі Алена Ляшкевіч. — Не праблема яго аднавіць, калі будзе ініцыятыва з раёна. Напрыклад, у Мінскім раёне Ракаўскі цэнтр фальклору прапануе паслугі для маладых: цалкам забяспечвае правядзенне вясельнага абраду згодна з традыцыяй. У нашым таварыстве таксама дзяўчаты прапануюць правядзенне вясельнага абраду на пэўным вакальным матэрыяле. Для Горацкага раёна нашы напрацоўкі маглі б стаць добрай падставай для перайманння традыцый.

А была яшчэ некалі і свая сацыяльная культура. З чаго, напрыклад, нарадзіўся звычай «прыйсці на пячонку», пра які даведаліся ў вёсцы Шышава? Калі гаспадар забіваў кабанчыка, то суседзі (уся вёска практычна) маглі прыйсці да яго на свежыну. У выніку ад кабанчыка ў гаспадара магла застацца адна траціна... Цяпер традыцыя не мае такога бытавання. А раней жа запрашалі не толькі на свежыну — і на мёд свежавыгнаны, на ягады, якія з лесу толькі прынеслі, на яблыкі. Такія абрады, адзначаюць даследчыкі з таварыства, асабліва характэрныя для ўсходняй Магілёўшчыны. Яны аб'ядноўвалі на нейкі перыяд часу вясковую грамаду. Гэта працяг традыцый братчыны — формы самаарганізацыі вясковай абшчыны. Ладзіліся бяседы, гулялі адзін год у адной вясковай хаце, другі — у другой. Таксама абрады пераносу свечкі, пра якія памятаюць у Горацкім раёне, і «пячонкі» — рэшткі калектыўных абрадаў вясковай абшчыны: разам лягчэй і весялей было жыць.

Можа, таму так цёпла маладых даследчыкаў і сустрэлі людзі: нагода спяваць, танцаваць разам. Атрымліваецца жывы абмен. Перайманне народных традыцый у дзеянні. Перадача агню...

ЧЫРВОНА-ЧОРНАЕ НА БЕЛЫМ

І часта — сапраўды перадача, калі гаворка вядзецца пра матэрыяльныя ўзоры народнай культуры. Альбо набыццё. Кашуля, якая вылучалася сярод прывезеных з экспедыцыі рэчаў, стала самым першым матэрыяльным аб'ектам, які знайшлі студэнты. І такія яны ўжо дасведчаныя сталі ў асаблівасцях вышывак, што зразумелі адразу: такога яшчэ не было. У Горацкім раёне ў «жаночых» рамёствах наогул вялікае багацце: тут сустракаецца і геаметрычная вышыўка, і вышыўка гладдзю, у больш позніх вырабах — раслінныя ўзоры чырвона-белай гамы і каляровыя, а то і іх спалучэнне. Тут сышліся розныя тэхнікі і каляровыя гамы. Традыцыйная чырвона-чорная вышыўка процягам ці крыжыкам, а могуць таксама сустрэцца розныя тэхнікі ў адным вырабе.

— Што ўразіла, дык разнастайнасць вязаных шыдэлкам карункаў — па іх можна рабіць асобную выставу, бо кожны ручнік і фартух імі ўпрыгожаны, — Ганна Якуш гатова паказаць прыклады розных карункаў, якія ніколі не паўтараліся. — Рыса гэтага рэгіёна — кумачовыя ўстаўкі на канцах ручнікоў, таксама аздобленыя карункамі. Прышываліся карункі і крамныя, не толькі самаробныя.

Паясы, абрусы, посцілкі, элементы вопраткі... Дзяўчатам, якія асвойваюць ткацтва і іншыя жаночыя рамёствы, будзе што вывучаць. Ды ў музеі Горацкім далі магчымасць паглядзець на асаблівасці адзення — можа, будзе магчымасць самім штосьці падобнае стварыць на мясцовы манер. Нават свая традыцыя завязвання і нашэння намітак тут была!

Але асаблівую ўвагу студэнтак прыцягнула адна рэч з жаночага гардэробу: саян (сарафан) — характэрнае для гэтага раёна адзенне, бо тут памежжа са Смаленскай вобласцю.

А ГАВОРКА — ЗАСТАЛАСЯ...

Памежныя рэгіёны для экспедыцый Студэнцкае этнаграфічнае таварыства выбірае наўмысна. Бывалі экспедыцыі і па цэнтральнай Беларусі, але калі ехаць, то так, каб было больш карысці. Ёсць тут сэнс: на памежжы хутчэй знікаюць нацыянальныя асаблівасці. Але не толькі гэта стала прычынай такіх вандровак. Як правіла, навукоўцы, даследчыкі за дзяржаўную мяжу ў асноўным не ездзяць. Адпаведна, працуюць там даследчыкі іншых краін, і іх набыткі нам амаль не даступны. Студэнты ў сваіх экспедыцыях адначасова імкнуцца правесці даследаванні тэрыторый з адваротнага боку мяжы. Бывалі экспедыцыі на беларуска-латвійскае памежжа ці беларуска-расійскае каля Пскоўскай вобласці. Сёлета ўдалося некалькі дзён папрацаваць на Смаленшчыне, у Красненскім раёне.

— У аддзеле культуры Красненскага раёна нас сустрэлі цёпла, але ў іх толькі пачынаецца праца — новыя людзі ў аддзеле, — распавядае Барыс Шчука. — Насамрэч яны зацікаўлены ў культурным супрацоўніцтве, у запрашэнні на фестывалі, у абмене матэрыяламі. Чым гэта цікава нам? Па-першае, жыхары Красненскага раёна, якіх мы апытвалі, размаўляюць на ўсходнебеларускім дыялекце. І песні ў іх адпаведныя (у песенным фальклоры, як вядома, мова больш архаічная). Нездарма перапіс 100-гадовай даўніны паказаў, што 90 працэнтаў жыхароў тых мясцін запісалі сябе беларусамі. Цяпер вяскоўцы амаль ужо беларусамі сябе не лічаць, вось толькі гаворка засталася...

Памежныя раёны Пскоўскай і Смаленскай абласцей — гэта частка беларускага этнаграфічнага арэала, такое пацвярджэнне знаходзяць студэнты падчас экспедыцый. У 1930 годзе гэтыя тэрыторыі маглі далучыць да Беларусі: рыхтавалася чацвёртае ўзбуйненне БССР, і экспедыцыя Інбелкульта ў тыя гады вызначала будучыя межы. Калі даследчыкі вярнуліся, то ўсе яны былі арыштаваны. Землі засталіся ў складзе Расіі. Але страціць кантакты з іх жыхарамі — гэта значыць збядніць сябе. А яшчэ важна — падтрымаць іх: ёсць практыка матэрыялы экспедыцый ці іх копіі перадаваць у тыя мясціны, дзе яны сабраны. Каб там быў працяг.

ЖЫВАЯ СФЕРА

Кожны раён атрымае сабраныя матэрыялы ці іх копіі пасля пэўнай апрацоўкі, у тым ліку і вясковыя клубы. Гэтыя матэрыялы могуць быць карыснымі супрацоўнікам установу культуры, цікавымі студэнтам, навукоўцам, якія пішуць працы па гэтым рэгіёне, школьным настаўнікам, краязнаўцам. Папаўняецца свой архіў і сховішча — яны адкрытыя для ўсіх, хто цікавіцца. Ёсць дзеля чаго рупіцца.

— Экспедыцыі мы ладзім даўно, з 1998 года яны сталі штогадовымі і сістэматычнымі. Нам патрэбны былі зносіны з людзьмі, якія застаюцца носьбітамі традыцыйнай беларускай культуры. Інфармацыйны голад не маглі задаволіць бібліятэкі ці праца з архівамі. У моладзі, якая выбрала народную культуру сваёй сістэмай каштоўнасцяў, была патрэба ў жывой камунікацыі з носьбітамі культуры дзеля фарміравання свайго светапогляду. Большасць з нас выраслі ў гарадскіх умовах, і мы адчулі, што адбыўся разрыў паміж пакаленнямі: адно, два пакаленні выпалі з ланцуга пераемнасці. Але хацелася спазнаць тое сапраўднае, што ёсць у народнай культуры, — гаворыць кіраўнік арганізацыі Аляксей Глушко. — Для нас традыцыйная культура не толькі аб'ект даследавання, але і жывая сфера, якая патрабуе далікатнай падтрымкі і пераемнасці. Мы сябе з пэўнага часу ўсвядомілі пераемнікамі. Моладзь едзе ў экспедыцыю па жыццёвы досвед, па мудрасць.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Геральдычная калекцыя

ГОНАР РАДАВОДУ

Да нас у рэдакцыю прыйшоў ліст ад Анатоля Пяркальскага, які піша: «Я ўважліва сачыў за рубрыкай «Беларускія шляхецкія гербы» і ў апошніх нумарах газеты знайшоў прозвішча Пяркальскі — герб «Калумна». Звяртаюся да вядучага рубрыкі: «Магчыма, вы ведаеце, дзе жыве род Пяркальскіх?»

Уладзімір Крукоўскі адказвае:

— Пра сённяшніх Пяркальскіх з Маладзечанскага раёна ды з іншых мясцін Беларусі мне нічога невядома. Што тычыцца гістарычных звестак, то, як паведаміў мне Уладзіслаў Вяроўкін-Шалюта (суддзя выводны Беларускага згуртавання шляхты, найбольш дасведчаны ў пытаннях шляхецкай генеалогіі і геральдыкі), па звестках Дэпартамента геральдыі Расійскай імперыі, Пяркальскія валодалі маёнткамі ў Дзісненскім павеце (герба «Пярхала»), у Берасцейскім павеце (герба «Побаг») і ў Гарадзенскай губерні (герба «Рудніца», ён жа «Наступ»). Калі дадаць яшчэ Пяркальскіх герба «Калумна», то відаць, што гэта даволі разгалінаваны род. Каб высветліць, з якой вы галіны, трэба ведаць дарэвалюцыйнага продка па прамой лініі і месца яго пражывання. А тады ўжо звяртацца да спецыялістаў Нацыянальнага гістарычнага архіва РБ. Зычу поспеху у «вырошчванні» радаводнага дрэва!

■ Ад першай асобы

ПАГЛЫБЛЕННЕ Ў ТРАДЫЦЫЮ

ЧАМУ НЕ ВАРТА ЗАБЫВАЦЬ ПРА СВАЮ КУЛЬТУРНУЮ СПАДЧЫНУ

Для таго, каб размаўляць пра захаванне этна-культурнай спадчыны нават і нагода спецыяльная не патрэбна. Здаецца, для беларусаў гэтая тэма заўжды актуальная. Варта толькі выйсці на вуліцу ды паслухаць, на якой мове людзі размаўляюць. Што ўжо казаць пра традыцыйную музыку, адзенне, наогул мастацтва. Вячаслаў КАЛАЦЭЙ, лідар постфольк-гурта «Ветах», а таксама загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва, расказаў пра адну сенсацыйную знаходку, беларускія этна-фестывалі ды нашых спевакоў узроўню Шаляпіна. А таксама паразважаў пра тое, чаму на беларускай культуры пакуль так і не навучыліся зарабляць, як выхаваць новае пакаленне сапраўдных беларусаў і вярнуць дуду ў побытавы ўжытак.

Фота Вольгі СТАЛЯРОВАЙ.

ЁСЦЬ ФЕСТЫВАЛІ...

Што такое этнічная музыка? Гэта музыка, перанятая вусным шляхам (без нот) ад «майстра» — носьбіта традыцыі. У этнамузыцы важная сувязь з мясцовай традыцыяй, стыль і манера, тым больш што на Беларусі аўтэнтычны фальклор захаваўся ў фоназдапісах, відэафільмах і часам яшчэ ў жывым бытаванні. Некаторыя з нас слухалі легендарных Сцяпана Дубейку і Ганну Вянгуру, шмат хто яшчэ пачуе Міхася Басякова. Гэта — спевакі ўзроўню Шаляпіна. Яны — самародкі і прадстаўнікі буйной і віртуознай школы беларускіх этнаспеваў, і нам вельмі пашанцавала, што іх галасы былі зафіксаваны аўдыявізуальным антраполагам Зінаідай Мажэйкай.

Традыцыйная музыка — гэта асобная культура: каб яе асэнсаваць і далучыцца да яе, трэба прыкласці пэўныя намаганні і патраціць пэўны час, які ў сучаснага чалавека не заўсёды ёсць. Можна хуценька надзець народны строй, узяць інструменты і сказаць, што я — пераемнік фальклору. Але гэта толькі першы крок.

У Беларусі недастаткова фестываляў, прысвечаных традыцыйнай культуры. У той жа Літве, напрыклад, каля 100 этнафестываляў, якія ладзіць іх камісія ЮНЕСКА. А ў нас нават няма спецыяльных фестываляў, зарыентаваных на дударскую музыку. У Ірландыі праводзяцца фестывалі ірландскай дуды. Альбо вось мы з «Ветахам» наведвалі фестываль дударскай музыкі ў Малай Лігоце (Славакія). Славакія ўнікальная тым, што славацкая дуда — гайда — захавалася там у жывым бытаванні. Туды на фэст тывалі з'язджаюцца і ў нас. Магчыма, будуць і фестывалі этнічных спеваў, якія ў нас захаваліся ў жывым бытаванні: фальклорны гурт вёскі Ананьчыцы Салігорскага раёна, «Стаўбонскія вячоркі» Веткаўскага раёна.

Калі бізнесмены даюць грошы на развіццё этнічнага мастацтва, ім павінны зніжаць падаткаабкладанне.

ПЛЮС ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫ МЕНЕДЖМЕНТ

— Сапраўды, ёсць шмат пытанняў па ўспрыманні сучасным чалавекам музыкі, якая зарыентавана на традыцыйны лад жыцця і традыцыйнае мастацтва. Але тут замкнёнае кола. Калі гэтага мастацтва не будзе ў медыйнай прасторы, мы яго ніколі не палюбім. Традыцыйная культура павінна захоўвацца — дзеля таго, каб захоўваўся этнас. Гэта аксіёма, сучасная навука даказала — калі няма традыцыйнай культуры, фальклору, спеваў, этнічнай музыкі — народ непазбежна загіне і знікне з гістарычнай арэны. А таму першы, хто павінен клапаціцца пра захаванне традыцыйнага мастацтва — гэта дзяржава, якая будзе існаваць, толькі пакуль яе грамадзяне будуць адчуваць сябе асобным народам.

Беларусы ўжо даказалі, што ў іх разуменне важнасці захавання спадчыны ёсць. Яшчэ ў 1990-я гады, калі пачалі з'яўляцца так званыя постфальклорныя калектывы. Калі гараджане бралі народныя інструменты, надзявалі традыцыйныя строі, развучвалі песні і ўсё гэта прапаноўвалі гледачам. Адным з першых калектываў быў гурт «Ліцвіны» Уладзіміра Берберава. Таксама быў спеўны калектыў «Дзянніца». Потым з'явіліся «Госьціца», капэла Алеся Лася. Апошні калектыў займаўся дударскай, смыковай музыкай і дыятанічнымі цымбаламі. Сёння ёсць гурт «Рада». Сярод спевакоў можна назваць Наталлю Матыліцкую, якая выйшла з «Ліцвінаў».

— Безумоўна, без падтрымкі грамадства гэта немагчыма. Як і без істотнай падтрымкі дзяржавы таксама. Таму што каб займацца мастацтвам — трэба мець вольны час і сродкі. Носьбіты традыцыйнай культуры ў свой час забяспечвалі сябе працай на зямлі. Сучасны чалавек мае значна менш вольнага часу на творчасць. Таму, я лічу, будучыня этнічнай музыкі звязана з адукацыйнымі, мастацкімі, даследчыцкімі аспектамі. Насамрэч праблема захавання этнічнай музыкі — даволі сур'ёзная. І ў свеце, і ў Беларусі. Наш геніяльны этнамузыколаг Зінаіда Мажэйка нават выдала кнігу, якая так і называецца — «Экалогія традыцыйнай музычнай культуры». Раскупілі яе імгненна.

Першая прыступка да таго, каб захаваць нашую традыцыйную культуру — трэба захоўваць яе ў структурах паўсядзённасці. Калі з маленства дзіця будзе чуць этнічную музыку ці будзе ездзіць з бацькамі ў вандроўкі, адзначаць традыцыйныя святы, то з часам у яго сфарміруецца натуральная патрэба ў традыцыйнай культуры, і пасталеўшы, ён міма гэтага ўжо не пройдзе.

Вельмі небяспечна, што мы не маем менеджменту і маркетынгу, якія мэтанакіравана працавалі б на папулярызацыю этнічнай культуры і выводзілі яе на міжнародны ўзровень. Куды знікаюць менеджары культуры? Мы кожны год выпускаем менеджараў, якія, быццам бы, павінны папулярызаваць культуру беларусаў, праводзіць маркетынгавыя даследаванні. Але, напэўна, падчас навучання іх недастаткова паглыбляюць у этнатрадыцыю. Да таго ж у моладзі ўсё адно ёсць жаданне хуткіх грошай, заробку: маўляў, навошта корпацца з этнічнай культурай, калі можна правесці карпаратыў альбо канцэрт танцавальнай музыкі — больш аголенага цела, стразаў, шампанскага і піва — гэта ўсё добра акупляецца. Але будзем шчырымі: усё, што «ніжэй пояса», арганізоўваецца аўтаматычна, таму, што людзі біялагічна на гэта зарыентаваны, а да таго, што звязана з духоўнымі з'явамі, больш складана прыцягнуць увагу.

Ва ўсім свеце тое, што звязана з этнічным мастацтвам, па-іншаму абкладаецца падаткамі, фінансуецца і датуецца. Ёсць пэўная сістэма падатковых зніжак. Калі бізнесмены даюць грошы на развіццё этнічнага мастацтва, ім зніжаюць падаткаабкладанне. А той, хто займаецца традыцыйным мастацтвам на камерцыйнай аснове, мае нейкія падатковыя льготы. Некалі ў Беларусі быў законапраект, які мусіў гэта ўрэгуляваць. Але на пэўным этапе ён забуксаваў. Ці тое дакладна не вызначылі, што лічыць традыцыйным мастацтвам, ці пабаяліся, што будуць злоўжыванні. Пакуль што нашае заканадаўства не гатова стымуляваць традыцыйную культуру.

ДЗЕЦІ КУЛЬТУРЫ

— Моладзь заўсёды цікавіцца мастацтвам. Сёння кажуць, што моладзь стала больш прагматычная і імкнецца атрымаць выгаду хуткімі спосабамі, але ўсё роўна ва Універсітэт культуры конкурсы даволі высокія. Нават сёлета. Нашая спецыяльнасць — этнафоназнаўства — маладая, набіраем з 2004 года. Але ахвотнікі вучыцца ёсць заўжды. Людзі, якія прыходзяць да нас, належаць да дзвюх катэгорый. Першая — вясковая моладзь, якая пазнаёмілася з мастацтвам сваёй малой радзімы ад бацькоў, бабуль, часткова ў межах праекта «Берагіня» (да нас шмат выпускнікоў гэтага праекта ідзе паступаць). Другая — гарадская моладзь, якая мае да фальклору экзатычны інтарэс, ім гэта цікава на эксперыментальным узроўні. Мы знаёмім іх з этнічнай музыкай беларусаў. Навучанне пабудавана выключна на вусным перайманні — так, як было ў традыцыйнай культуры. Студэнты ездзяць у фальклорныя экспедыцыі: калі ты не пачуў, як спявае носьбіт традыцыі, пажадана ўжывую, то не зможаш ні імправізаваць, ні пераняць манеру выканання.

У нас кожны курс — калектыў. Сістэма, як ва ўсіх творчых ВНУ, — кіраўнік курса набірае сабе навучэнцаў і вядзе іх да самага заканчэння. Таму што навучанне звязана з вялікім паглыбленнем у традыцыю. І выкладчыкі ў нас цудоўныя: галоўны рэжысёр «Берагіні» Мікола Козенка, Тамара Варфаламеева, Вольга Лабачэўская, Таццяна Пладунова, Эвеліна Шчадрына, Аляксей Рагуля, Энгельс Дарашэвіч.

САМЫ ДЭМАКРАТЫЧНЫ ІНСТРУМЕНТ

— Дуда — карэнны інструмент беларусаў. У свой час ён быў самым распаўсюджаным інструментам. Расійскія даследчыкі XIX стагоддзя абсалютна адназначна казалі, што самы галоўны інструмент беларусаў — дуда. Пісьменнік-рамантык Лажэчнікаў у рамане «Ледзяны дом» апісвае сцэну, калі ў Санкт-Пецярбург запрасілі з усёй былой Расійскай імперыі прадстаўнікоў кожнага народа са сваім музычным інструментам. І менавіта беларус надзьмуваў валынку. А Лажэчнікаў гадоў 15, здаецца, быў генерал-губернатарам Віцебска, меў магчымасць добра вывучыць беларускую традыцыйную культуру.

Яшчэ ў XIX стагоддзі дуда вельмі актыўна бытавала, і практычна ўсё жыццё беларуса праходзіла пад яе акампанемент. Так доўжылася да сярэдзіны XX стагоддзя. Дзякуй Богу, за гэты час нашыя навукоўцы паспелі зрабіць замалёўкі беларускай дуды, фотаздымкі, аўдыя- і нават відэазапісы. Ёсць відэазапіс 1939 года, які зафіксаваў выкананне на аўтэнтычнай беларускай дудзе: рэжысёр Кармазінскі зняў дакументальны спецвыпуск, прысвечаны беларускай народнай музыцы. Там калі 30 секунд аўтэнтычнага выканання на беларускай дудзе. Прычым іграе дуэт дудароў. Гэты відэазапіс знайшоў не так даўно — у 2012 годзе — Канстанцін Рэмішэўскі ў Койданаўскім архіве. Артыкул пра гэта мы напісалі разам з ім. І ён быў надрукаваны ў адным з самых вядомых санкт-пецярбургскіх этнамузыкалагічных часопісаў Musicus. Гэта даволі сенсацыйная знаходка.

У сярэдзіне XX стагоддзя дуда пачала актыўна знікаць. На вёсцы яе выцясняў гармонік, які з'явіўся ў канцы XIX стагоддзя, быў больш гучным і простым у эксплуатацыі. Дударскую традыцыю (карэнную для цэнтральнай і паўночнай Беларусі), якая перапынілася ў сярэдзіне XX стагоддзя, пачалі аднаўляць у 1980-х гадах народныя майстры. Аднымі з першых былі Уладзімір Пузыня і Уладзімір Гром. Потым далучыліся Алесь Лось, Віктар Кульпін, Тодар Кашкурэвіч, Алесь Жура, Дзяніс Сухі. Але, каб цалкам аднавіць культуру выканання на дудзе, выканальніцкую манеру і яе распаўсюджанне ў краіне, трэба наладзіць фабрычную, масавую вытворчасць інструмента. Трэба, каб на дудзе вучылі граць у музычных школах і пра яе распавядалі на ўроках спеваў у сярэдніх школах і садках.

Будзем шчырымі: усё, што «ніжэй пояса», арганізоўваецца аўтаматычна, таму, што людзі біялагічна на гэта зарыентаваны, а да таго, што звязана з духоўнымі з'явамі, больш складана прыцягнуць увагу.

Наколькі я ведаю, у планах Міністэрства культуры гэта ёсць. Толькі так дударская традыцыя пачне спакваля вяртацца на Беларусь. Калі гэта атрымаецца «прабіць», то, сапраўды, дуда можа сыграць вялікую ролю ў захаванні этнічнай музыкі беларусаў і ў музычным развіцці дзяцей і моладзі. Гэта інструмент надзвычай дэмакратычны, на яго ідэальна кладзецца беларуская танцавальная, карагодная і спеўная музыка, якая ў асноўным пад яго і складалася. І ў моладзі ёсць цікавасць да гэтага інструмента. Нават у тым жа рэканструктарскім руху. Моладзь бачыць нейкія перакрыжаванні з еўрапейскай культурай, і ёй гэта падабаецца. Так можна прывабіць да народнага мастацтва людзей, якія на першы погляд абсалютна далёкія ад яго: карэнных гараджан, якія, можа, і на вёсцы ніколі не былі. Тым не менш яны праяўляць да гэтага цікавасць. Гэта вельмі каштоўна.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 14.10.2013 г. в 10.00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц-зал.

Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком»,

находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

ЛОТ 1. Помещения 1-го этажа в здании, расположенном по адресу: ул. Мариненко, 16, в г. Полоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 66,1 кв.м (19,0; 34,1; 10,2; 2,8), срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 16,525 БАВ; размер задатка – 1,6525 БАВ, коэффициент (п.8.2 Указа № 150) составляет 3,0.

Предполагаемое целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складского помещения, оказания услуг.

Документы на участие в аукционе принимаются **с 11.09.2013 г. по 11.10.2013 г.** в рабочее время (с 9.00 до 17.00) по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные **после 17.00 11.10.2013,** не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с № 3012072841543 в филиале № 200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657, Витебский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

Телефоны для справок (0212) 27 29 42, 27 11 58, факс (0212) 27 18 81.

Информация о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков для индивидуального жилищного строительства

ПРОДАВЕЦ – РАКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

Лот	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
